

СУЧАСНАЕ БЮРО ЗНАХОДАК 7

РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРЫЧАК 8



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 СНЕЖНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 238 (28854)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Пры падрыхтоўцы беларуска-расійскага пагаднення аб узаемным прызнанні віз бакі здолелі знайсці разумны баланс кампрамісаў. Розныя варыянты былі, але я лічу, што ў канчатковым выніку дасягнуты прымальны для ўсіх бакоў варыянт. Для беларускага боку было галоўным, каб грамадзяне трэціх краін маглі беспрашкодна праязджаць сумесную мяжу. У нас ёсць агульная мяжа ў рамках Саюзнай дзяржавы, яе ахова забяспечваецца надзейным чынам. З'яўляючыся транзітнай дзяржавай, мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб наша сумесная мяжа была не перашкодай, а забяспечвала магчымасць свабоднага перамяшчэння. Нам здаецца, што гэта пагадненне дае такую магчымасць».*

# НАШ ШЛЯХ У АФРЫКУ



Фота БелТА.

## Беларусь з афіцыйным візітам наведвае Прэзідэнт Рэспублікі Судан Омар Хасан Ахмед аль-Башыр

**Гэты візіт з'яўляецца лагічным працягам развіцця двухбаковых адносін паміж нашай краінай і ўсходнеафрыканскай дзяржавай. Моцны штуршок быў дадзены паўтара года таму, калі Прэзідэнт Беларусі ўпершыню ў гісторыі двухбаковых адносін наведаў Судан. «Нам удалося тады дасягнуць шэрагу дамоўленасцяў, якія змогуць безумоўна вывесці нас на вельмі высокі ўзровень супрацоўніцтва, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, вітаючы афрыканскага калегу ў Палацы Незалежнасці. — Мы поўныя рашучасці рэалізаваць усе дамоўленасці настолькі хутка, наколькі на тое будзе воля суданскага боку».**

СТАР. 2

Перспектыва

# КЛУБНІЦЫ БЕЗ НІТРАТАЎ І АГУРКІ БЕЗ ПЕСТЫЦЫДАЎ

**Мы зацікаўлены ў пастаўках арганічнай прадукцыі на экспарт**

**У лістападзе быў прыняты закон «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі». Дакумент уступае ў сілу праз год пасля яго афіцыйнага апублікавання — 18 лістапада 2019-га. Што зменіцца да таго часу і што робіцца ўжо зараз?**

### Пазіцыя аграрыяў

За апошняе паўстагоддзе прыкметна ўзмацнілася залежнасць інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі ад унясення мінеральных угнаенняў, пестыцыдаў, гербіцыдаў, выкарыстання хімічных сродкаў аховы раслін. Гэта ставіць пад пагрозу здароўе прыроды і чалавека. Рэшткавыя дозы хімічных элементаў назапашваюцца ў глебе, у прадуктах харчавання. Менавіта таму ў свеце з'явіўся новы трэнд — вырошчванне экалагічна чыстых прадуктаў.

СТАР. 6



Ведай нашых!

# Беларуска — галоўная прыгажуня Еўропы

**На конкурсе «Міс свету — 2018» Марыя Васілевіч увайшла ў топ-5**

**У суботу, 8 снежня, фінішаваў найстарэйшы і адзін з самых прэстыжных конкурсаў прыгажосці — «Міс свету», які на працягу месяца праходзіў у кітайскім горадзе Санья. Упершыню ў гісторыі прадстаўніца Беларусі, 21-гадовая мінчанка Марыя Васілевіч увайшла ў топ-5 фіналістак. Менавіта беларуску журы назвала самай прыгожай дзяўчынай на еўрапейскім кантыненце.**




Фота missworld.com.

Тытул новай каралевы прыгажосці атрымала 26-гадовая прадстаўніца Мексікі Ванеса Понсэ дэ Леон — мадэль, тэлевядучая, валанцёр дабрачыннай арганізацыі па падтрымцы дзяўчат-мігрантак і ўладальніца навуковай ступені ў сферы бізнесу і эканомікі. Таксама ў пяцёрцы найлепшых — каралевы прыгажосці сваіх кантынентаў: «Міс свету Карыбы» Кадзіджа Робінсан з Ямайкі, «Міс свету Афрыка» Квіін Абенакіё з Уганды, «Міс свету Азія і Акіянія» Нікалін Пічапа Лімснукан з Тайланда, «Міс свету Амерыка» Саларыс Барба з Панамы (яе абвясцілі дадаткова, як замену на гэтай «пасадзе» канкурсанткі з Мексікі) і прадстаўніца Беларусі Марыя Васілевіч, якая атрымала тытул «Міс свету Еўропа».

СТАР. 5

## КОРАТКА

**• Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лістападзе 2018 года ў параўнанні з кастрычнікам склаў 100,6 %, са снежнем 2017 года — 104,8 %.**

• Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі правядзе маніторынг арганізацыі харчавання работнікаў на прадпрыемствах.



**• Беларусь і Эстонія дамовіліся аб узаемным пенсійным забеспячэнні грамадзян дзвюх краін.**

• Спецыяльны фармат «Карткі госця», брэндаваны для II Еўрапейскіх гульняў, паступіў у продаж. Картка разлічана на 10 дзён (240 гадзін) і каштуе Br16,5.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# НАШ ШЛЯХ У АФРЫКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Судана пацвердзіў, што ў дзвюх краін ёсць супадзенні поглядаў у палітычнай сферы і ўзаемны эканамічны інтарэс. «Рэальны вынік вашага візіту ў Судан — наша рашэнне адкрыць пасольства ў Беларусі, — сказаў Омар Хасан Ахмед аль-Башыр. — Мы сумесна з Беларуссю можам шмат зрабіць».

На сустрэчы прэзідэнтам удалося дамовіцца па шэрагу ключавых пытанняў. Пра гэта на перагаворах у пашыраным складзе паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

«З мэтай паляпшэння ўзаемных разлікаў у гандлі мы дамовіліся, што беларускія кампаніі будуць здабываць золата на вашай тэрыторыі, вашы нетры вельмі багатыя на гэты метал, і я вам удзячны — вы сёння прынялі рашэнне аб выдзяленні нам другога радовішча золата», — звярнуўся ён да лідара Судана.

Яшчэ адно буйное дасягненне афіцыйных перагавораў двух прэзідэнтаў у Мінску — пагадненне аб стварэнні ў Судане зборачных прадпрыемстваў і сельскагаспадарчых комплексаў поўнага цыкла. «У найбліжэйшы час мы адкрыем у Судане машынабудаўнічы цэнтр, дзе будзе ажыццяўляцца зборка трактароў, аўтамабіляў, будаўнічай тэхнікі. Таксама мы створым у вас малочнатаварныя комплексы і цяпліцы па вырошчванні агародніны і расады ў закрытым грунце», — пералічыў Прэзідэнт Беларусі.

Ён запэўніў, што Беларусь гатова аказваць грамадзянам Судана медыцынскую дапамогу па ўсіх напрамках, якія будуць іх цікавіць, а таксама навучыць суданскіх спецыялістаў высокатэхналагічным медыцынскім аперацыям.

«Мы гатовы падрыхтаваць вашых спецыялістаў для работы на той тэхніцы, якую будзем вырабляць на тэрыторыі Судана, — дадаў ён. — На месцы ў створаных цэнтрах мы будзем навучаць вашых грамадзян».

Прэзідэнт Беларусі выказаў гатоўнасць да супрацоўніцтва і ў гуманітарнай сферы: адукацыі, навуцы, спорце.

«Толькі што, спадар Прэзідэнт, вы прынялі лёсавызначальнае рашэнне для беларуска-суданскага супрацоўніцтва — аб адмене падатку на вырабленую тэхніку для таго сумеснага прадпрыемства, якое будзе працаваць у Хартуме, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта павысіць яе канкурэнтаздольнасць, і я думаю, што мы зможам прадаваць яе не толькі ў Судане, але і па ўсёй Афрыцы».

Беларускі лідар падзякаваў Омару аль-Башыру за асабістую падтрымку сумесных ініцыятыў і праектаў. «Мы гатовыя да адкрытага дыялогу, абмеркавання актуальных пытанняў супрацоўніцтва ў інтарэсах народаў нашых краін», — дадаў ён.

Пасля сустрэчы ў шырокім складзе быў падпісаны шэраг міжурадавых дакументаў у сферы права і падаткаў, а таксама пагадненні паміж міністэрствамі, ведамствамі і кампаніямі дзвюх краін аб супрацоўніцтве. Кіраўнікі дзяржаў падпісалі сумесную заяву, у якой далі ацэнку ўзаемадзеянню і пацвердзілі важнасць развіцця гандлёва-эканамічных адносін.

Прэзідэнт Беларусі ацаніў вынікі перагавораў як плённыя. «Судан застаецца нашым важным і надзейным партнёрам у Афрыцы. У нас выдатныя палітычныя адносіны. Мы вітаем адкрыццё суданскага пасольства ў Беларусі, у сваю чаргу гатовыя да такіх жа крокаў на тэрыторыі Судана», — заявіў ён.

Асноўная ўвага на перагаворах у Мінску ўдзелена гандлёва-эканамічным адносінам. Патэнцыял у дзвюх краін, якія знаходзяцца на стыку найважнейшых рэгіёнаў, — найшырэйшы, перакананы беларускі лідар. Беларусь злучае Еўропу і Азію, уваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз. Судан з'яўляецца мостам паміж арабскай цывілізацыяй і Афрыкай, брамай у афрыканскі кантынет. «І нам ёсць што прапанаваць гэтаму рэгіёну, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Таму неабходна і надалей працаваць разам, ствараць сумесныя прадукты для іх прасоўвання як у Афрыцы, так і тут, у Еўразіі».

Неабходна працягваць работу па вывадзе беларуска-суданскага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай сферы, на новы, больш высокі якасны ўзровень, падкрэсліў ён. «Пра гэта мы дамовіліся з маім калегам Омарам аль-Башырам. Мы таксама дамовіліся аб супрацоўніцтве з Паўднёвым Суданам, і я прапанаваў, каб тры краіны маглі арганізаваць супрацоўніцтва: Судан, Паўднёвы Судан і Беларусь».

Самая галоўная дамоўленасць — да наступнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Хартум пертварыць падпісаныя дакументы ў жыццё. У Судане павінны з'явіцца сумесны машынабудаўнічы цэнтр, сельскагаспадарчы комплекс і цяпліцы па беларускіх тэхналогіях і наладжана сумесная здабыча золата.

Прэзідэнт Рэспублікі Судан пацвердзіў, што ўсе падпісаныя ў Мінску і раней у Хартуме дакументы стварылі добрую глебу для развіцця двухбаковых эканамічных адносін. «Мы ў Судане будзем сачыць за рэалізацыяй усіх дамоўленасцяў, бо яны надаюць вялікі імпульс далейшаму супрацоўніцтву. Для Судана і Беларусі гэта пачатак стратэгічных адносін», — заявіў Омар аль-Башыр. Ён запэўніў, што ўсе гэтыя дакументы будуць рэалізаваныя да наступнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Судан.

«Немалаважнае адкрыццё беларускага пасольства ў Хартуме, — звярнуў увагу Прэзідэнт Судана. — Гэта таксама будзе выконваць вялікую ролю ў развіцці адносін і рэалізацыі намечаных праектаў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА: ПРАЦА НЕ СКОНЧАНА

**10 снежня 1948 года была прынятая Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. З таго часу сусветная супольнасць адзначае гэты дзень, бо ён нясе ідэю роўных магчымасцяў для кожнага, незалежна ад полу, расы і іншага. Учора, у 70-годдзе дэкларацыі, у Нацыянальную бібліятэку Беларусі перадалі выданне гэтага дакумента на беларускай мове.**

«Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, як і іншыя лёсавызначальныя тэксты ў гісторыі чалавецтва, менавіта на роднай мове мае для кожнага народа глыбокае значэнне, — сказаў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй ДАПКЮНАС.** — Усведамленне чалавекам сваіх неад'емных правоў і шчырае шанаванне ім матчынай мовы сугучны ў тым, што яны ідуць ад сэрца. І таму кожная дзяржава, якая разумее гэта, здольная як праз забеспячэнне эфектыўнай аховы правоў чалавека, так і праз зацікаўленую падтрымку роднага слова садзейнічаць невычэрпнай крыніцы грамадскай падтрымкі намаганняў дзяржавы на цярністым шляху дасягнення ўстойлівага развіцця грамадства, міру і бяспекі».

Намеснік міністра звярнуў увагу на тое, што дэкларацыя «дала разуменне ўсяму свету, што абарона роўнасці, справядлівасці, чалавечай годнасці — гэта агульны абавязак усіх краін і ўрадаў». Разам з тым супрацоўнік МЗС падкрэсліў, што, на жаль, яшчэ застаюцца мільёны людзей, якія дагэтуль пакутуюць з-за голаду, хвароб, жывуць ва ўмовах гвалту ці канфлікту, пазбаўленыя эфектыўных сродкаў прававой абароны.

Таксама Андрэй Дапкюнас упэўнены, што пытанні правоў чалавека неабходна разглядаць поруч з пытаннямі бяспекі і ўстойлівага развіцця. У нашай краіне многія добра знаёмы са зместам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. «Аднак далучэнне да яе ідэй новых пакаленняў — гэта абавязак кожнай дзяржавы, кожнага з нас, дзяржаўных служачых, дыпламатаў, навукоўцаў, медыйных работнікаў, проста кожнага неабыякавага чалавека», — падкрэсліў намеснік міністра.

**Іаанна КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ, пастаянны каардынатар ААН і пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі,** расказала аб працы яе арганізацыі ў распаўсюджванні правоў чалавека ў розных галінах нашай краіны. У прыватнасці, закранула пытанні папярэджання хатняга гвалту і аховы яго ахвяр, патрэб дзяцей і людзей з інваліднасцю. Яшчэ раз спадарыня Казана-Вішнявецкі нагадала аб працы з мігрантамі і бежанцамі ды іншымі групамі людзей, якім сёння патрэбна падтрымка.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# «Жыццё — гэта не кіно»

## МНС прадстаўляе новую серыю білбордаў

**Апошнія — магутны інструмент, які актыўна выкарыстоўваецца МНС для прапаганды бяспекі. Новая крэатыўная рэклама ад ратавальнікаў у гэтым жанры называецца «Жыццё — гэта не кіно».**

Гэта серыя білбордаў ад ратавальнікаў прысвечана гісторыям пра герояў, у якіх фантастычныя здольнасці. Але, на жаль, у рэальным жыцці людзі не валодаюць звышчалавечай сілай, рэакцыяй або спрытам, не ўмеюць лётаць, высока скакаць або рэгенераваць сваё здароўе. Нам непадуладна бесперашкодна прайсці скрозь падпалены дом, прабыць пад вадой дзясяткі хвілін або маментальна зрэагаваць на крытычную сітуацыю. Звычайны чалавек — далікатны і ўразлівы. Серыя білбордаў «Жыццё — гэта не кіно» ў арыгінальным фармаце расказвае, што ў нашым жыцці не павінна быць месца неабдуманым «подзвігам», якія могуць прывесці да сумных наступстваў.

Усе плакаты серыі можна знайсці на сайце міністэрства ў раздзеле «Мультымедыя па АБЖ», у якім сабраны найлепшыя напрацоўкі Рэспубліканскага цэнтра прапаганды. Сярод іх ёсць самая разнастайная прадукцыя, закліканая ў яркай, цікавай і простай форме расказваць беларусам пра асноўныя правілы бяспекі: гэта сацыяльная рэклама «У свеце жывёл», «Цана імгнення», «112. Дапамога побач», «Ганарымся, што навучылі!» і сумесны праект з ЮНІСЕФ «МНС дзякуе клапатлівым бацькам».

Выкананне правіл бяспекі — неабходнасць, якую павінен улічваць кожны чалавек у паўсядзённым жыцці. І калі вы хочаце змяніць свет, як гэта робяць супергерoі ў касавых стужках, то пачніце з сябе, нагадваюць ратавальнікі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Блок Пашыняна набраў большасць галасоў на парламенцкіх выбарах у Арменіі



Блок выконваючага абавязкі прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна «Мой крок» набраў 70,43 % галасоў на выбарах у парламент па выніках апрацоўкі бюлетэняў з усіх 2010 выбарчых участкаў краіны, паведамляе ЦВК Арменіі.

У парламент таксама па выніках выбараў праходзяць партыі «Квітнеючая Арменія» (8,27 % галасоў) і «Асветчаная Арменія» (6,37 %). Для праходжання ў парламент партыям трэба набраць мінімум 5 % галасоў выбаршчыкаў, блокам — не менш за 7 %. Былая кіруючая Рэспубліканская партыя Арменіі набрала толькі 4,7 % галасоў. Выніковая яўка на выбарах склала 48,63 %.

Па законе краіны палітычная сіла, якая набрала больш за 50 % галасоў, мае права на атрыманне канстытуцыйнай большасці ў парламенце — 54 % месцаў.

## Кіраўнік урада Каталоніі абвясціў галадоўку

Кіраўнік урада Каталоніі Кім Торэ пачаў двухдзённую галадоўку ў падтрымку каталонскіх палітыкаў, якія знаходзяцца ў папярэднім зняволенні, перадае La Vanguardia.

Згодна з апублікаванай інфармацыяй, галадоўка працягнецца да 9 гадзін раніцы 11 снежня. Такім чынам кіраўнік каталонскага ўрада спрабуе прадэманстраваць «салідарнасць, павагу і захапленне мужнасцю таварышаў у турме, якія абвясцілі галадоўку».

Адзначым, што пракуратура Іспаніі просіць прызначыць тэрміны зняволення да 25 гадоў для лідараў Каталоніі па абвінавачанні ў мяцяжы і растраце дзяржаўных сродкаў.

Нагадаем, канфлікт паміж Барселонай і Мадрыдам разгарэўся пасля таго, як каталонскі ўрад пад кіраўніцтвам экс-старшыні Карлеса Пучдэмона восенню 2017 года правёў рэферэндум аб незалежнасці рэгіёна ад Іспаніі. Іспанскія ўлады прызналі рэферэндум незаконным, а ў дачыненні да шэрагу прадстаўнікоў урада рэгіёна былі вылучаны абвінавачанні ў сепаратызме.

## Кангрэсмен-дэмакрат заявіў, што Трампу можа пагражаць турма пасля заканчэння паўнамоцтваў

Найстарэйшы дэмакрат у спецкамітэце Палаты прадстаўнікоў па разведцы Адам Шыф лічыць, што Дональду Трампу можа быць прад'яўленае абвінавачанне пасля заканчэння тэрміну яго прэзідэнцкіх паўнамоцтваў. З такім меркаваннем кангрэсмен выступіў у эфіры перадачы «Тварам да нацыі» тэлеканала CBS у нядзелю.

«Існуе вельмі рэальная магчымасць таго, што ў дзень, калі Дональд Трамп пакіне свой пост, міністэрства юстыцыі можа прад'явіць яму абвінавачанне. Ён можа стаць першым за доўгі час прэзідэнтам, якому па-сапраўднаму пагражае турэмны тэрмін», — перакананы Шыф.

Дэмакрат звязаў магчымасць прад'яўлення абвінавачвання Трампу са звесткамі, якія сталі вядомыя ў пятніцу, калі федэральныя пракуроры ў нью-ёркскім раёне Манхэтэн накіравалі ў суд Нью-Ёрка дакументы, з якіх вынікае, што юрыст Трампа Майкл Коэн выплачваў грошы экс-порнаактрысе і былой фотамадэлі ў абмен на іх маўчанне аб меркаваных інтымных сувязях з цяперашнім гаспадаром Белага дома па прамым указанні апошняга.

Як адзначала агенцтва Associated Press, гэта першы выпадак, калі следчыя ўказалі на патэнцыйную сувязь Трампа з меркаваным федэральным злачынствам.

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю ГАРНІШЭЎСКАГА Аляксандра Рыгоравіча, былога начальніка Салігорскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім.**

Наш фармат

# ПРАВА НА ДАБРЫНЮ

## Больш за 500 беларускіх дзяцей і падлеткаў намалявалі сваё бачанне правоў чалавека

Ужо больш за паўстагоддзя адзначаецца Сусветны дзень правоў чалавека. І ўпершыню да гэтай значнай даты, а таксама да 70-годдзя Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў Беларусі прайшоў творчы конкурс-выстаўка для дзяцей і падлеткаў «Намалюй свае правы». Арганізатарамі яго выступілі прадстаўніцтва ААН у нашай краіне, Міністэрства адукацыі. Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. На фінальны, рэспубліканскі этап паступіла больш як 500 работ юных мастакоў ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў. Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося падвядзенне вынікаў конкурсу і адкрылася выстаўка найлепшых работ яго ўдзельнікаў.

На жывапісных і графічных малюнках — дзіцячае асэнсаванне таго, што такое права на жыццё, на свабоду, на сям'ю, на навучанне, на медыцынскі догляд, на адпачынак і вольны час і г. д. Геаграфія конкурсу — усе рэгіёны Беларусі, а сярод прызёраў — выхаванцы творчых студый, аб'яднанняў па інтарэсах і мастацкіх гурткоў з Мінска, Гомеля, Дзяржынска, Баранавічаў, Камянца, Гродна, Жлобіна, Ліды, Брэста, Бабруйска і іншых гарадоў.

«Вы ведаеце, чаму Дэкларацыя правоў чалавека трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса? — захапіў увагу дзіцячай аўдыторыі **кіраўнік дэпартамента грамадскай інфармацыі прадстаўніцтва ААН у Беларусі**



**Віктар РАДЗІВІНОЎСКІ.** — Бо гэты дакумент перакладзены больш як на 500 розных моў свету і пакладзены ў аснову большасці канстытуцый!» Ён падзякаваў бацькам і педагогам за выхаванне ў дзецях не толькі разумення сваіх правоў, але і павагі да правоў і свабод іншых людзей.

Удзельнікі журы, якое ацэньвала дасланыя работы, прызналіся: выбіраць найлепшыя сярод паўтысячы малюнкаў і карцін, адны з якіх па-дзіцячы мілыя і непасрэдныя, другія — пранізлівыя і амаль што прафесійныя па ўзроўні, было вельмі складана. «Гэта калегіяльнае рашэнне. Асабіста мне, як юрысту, было важна, каб удзельнікі дакладна і зразумела даносілі ідэю свайго твора да нас, гледачоў. Магу шчыра сказаць, што дзеці вельмі глыбока, эмацыянальна паказалі тое, што бачаць у навакольным свеце. Ім, безумоўна, дапамагалі бацькі і педагогі, але дзіцячы погляд выразна адчуваецца, асабліва ў малодшай узроставай катэгорыі. Спадзяюся, што гэты момант — удзел у конкурсе, у цырымоніі ўзнагароджвання — застанецца ў іх памяці незалежна ад таго, хто стане ў будучыні мастаком, а хто проста вырасце неераўнадушным чалавекам», — адзначыў **начальнік упраўлення інтэрнэт-рэсурсаў Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Андрэй ГВАРДЗІЯН.**

Памятныя падарункі і дыпломы І, ІІ і ІІІ ступеняў у дзвюх намінацыях — «Жывапіс» і «Графіка» — атрымалі 30 лаўрэатаў выстаўкі-конкурсу, яшчэ 400 дзяцей узнагароджаны дыпломамі ўдзельнікаў. Таксама арганізатары зладзілі для ўсіх удзельнікаў цырымоніі салодкі стол і экскурсію па Нацыянальнай бібліятэцы, у сценах якой, дарэчы, да 20 снежня можна ўбачыць саму выстаўку «Намалюй свае правы. 70 гадоў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека» — у мабільнай галерэі на трэцім паверсе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара.**

Надвор'е

# А пад нагамі — мокры снег

## З пятніцы адмоўная тэмпература будзе нават удзень

**Напачатку тыдня ўмовы надвор'я ў нашай краіне будуць вызначаць атмасферныя франты, якія сфарміруюцца з боку Заходняй Еўропы. У сярэдзіне тыдня мы апынёмся пад уплывам цыклону, які будзе перамяшчацца ўздоўж паўднёва-ўсходніх межаў. Чакаецца воблачнае надвор'е з ападкамі, у асноўным у выглядзе мокрага снегу. А да канца працоўнага тыдня пачне паступаць халоднае паветра паўночных шырот. Пахаладае. У выхадныя дні ўсталюецца марознае надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень у асобных раёнах краіны пройдуць ападкі, у асноўным у выглядзе мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. У сераду ўначы месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца снег, мокры снег, па паўднёвым усходзе — слабая завіруха. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

Слабая мяцеліца чакаецца ў чацвер. У гэты дзень у многіх раёнах краіны будзе ісці снег і мокры снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпературны фон пачне паніжацца. Мінімальная тэмпература ўначы будзе 1—7 марозу, днём — ад нуля да мінус 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Беларусь вачыма расіян

## Журналісты расійскіх СМІ наведваюць нашу краіну

**Амаль 90 супрацоўнікаў газет, тэлеканалаў, інтэрнэт-выданняў, інфармацыйных агенцтваў і нават блогеры прымаюць удзел у чарговым прэстуры па нашай краіне. На беларускую зямлю прыехалі прадстаўнікі рэгіянальных, федэральных і саюзных СМІ Расійскай Федэрацыі.**

Нацыянальны прэс-цэнтр арганізаваў для калег насычаную тыднёвую праграму. Журналісты наведаюць Віцебскую, Мінскую вобласці і сталіцу. Ім пакажуць вядучыя прадпрыемствы гэтых рэгіёнаў, якія маюць моцныя эканамічныя сувязі з Расіяй у разнастайных сферах: паліўна-энергетычнай, аўтамабілебудаўнічай, сельскагаспадарчай («Нафтан», МЗКЦ, «Амкадор», «Штадлер Мінск» і іншыя).

Акрамя таго, у праграме візіту — знаёмства з Паркам высокіх тэхналогій, комплексам «Мінск-Арэна», аднойменым стадыёнам «Дынама». Аб падрыхтоўцы Беларусі да ІІ Еўрапейскіх гульняў раскажа міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук і дырэктар фонду «Дырэкцыя ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій Катулін. Завяршыцца вандроўка па Беларусі сустрэчай журналістаў (да іх таксама далучацца расійскія эксперты і палітолагі) з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам.

Суправаджаць расійскіх журналістаў, акрамя супрацоўнікаў Нацыянальнага прэс-цэнтра, будуць калегі з вядучых рэспубліканскіх СМІ.

Як праходзіць прэс-тур, чытайце на працягу тыдня на сайце «Звязды».

**Марыя ДАДАЛКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ЗАПАЛІЛІСЯ ЁЛКІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**У суботу лясныя прыгажуні зазіхацелі навагоднімі гірляндамі аднachасова ва ўсіх мястэчках Гродзенскай вобласці. А вось героі і забаўкі, дзякуючы якім у той дзень стварался святочны настрой, у кожным раёне былі свае.**



Ашмянскія Дзяды Марозы і Снягуркі прыехалі да ёлкі на незвычайных «карэтах». Тут вам і мотаблок, упрыгожаны казачным аленем, і легкавушка, якую апранулі ў адзенне Дзеда Мароза, і апырскавальнік «Раса», на капоце якога зіхацеў агнямі сімвал надыходзячага года — свіння. Разам з персанажамі мульціка «Шчанячы патруль», бабай Ягой, Лесуном яны забаўлялі дзятву і дарослых.

У Астраўцы Снегавік, Снежная каралева і пушыстыя лясныя жыхары бадзёрылі прысутных зарадкай і вясёлымі карагодамі.

А вось зялёная прыгажуня ў Карэлічах атрымала падарункі ад мясцовых жыхароў, і ўпрыгожылася самаробнымі шарамі, шышкамі, казачнымі дамкамі, паравозікамі і свінкамі.

**Ірына СІДАРОК.**

### САМАЛЁТ «ЧЫРКНУЎ» ГРУНТ

**Пры жорсткай пасадцы самалёта авіякампаніі «Белавія» ў аэрапорце Барысполь ніхто з пасажыраў і членаў экіпажа не пацярпеў, паведамілі ў прэс-службе авіяперавозчыка.**

Пасля пасадкі ў складаных метэаўмовах паветранае судна, якое выконвала рэйс B2845 па маршруце Мінск — Кіеў (аэрапорт Барысполь), пры прабегу правай стойкай шасі закранула грунт. Камандзір карабля ліквідаваў бакавое адхіленне самалёта, пасля чаго ён працягнуў рух па ўзлётна-пасадачнай паласе, зарулі'ўшы на пляцоўку для паркоўкі. Пры вырульванні, як паведамлялася, паветранае судна збіла ліхтары. Паласу на нейкі час закрылі, каб прыбраць яе.

Самалёт атрымаў нязначныя пашкоджанні (падрапаны абцякальнік). Праводзіцца расследаванне прычын інцыдэнту, зазначылі ў авіякампаніі.

Як паведамляла ТАСС, з-за інцыдэнту ў аэрапорце Барысполь былі адменены некаторыя рэйсы. Некалькі самалётаў перанакіравалі ў кіеўскі аэрапорт Жуляны, а таксама ў аэрапорты Львова, Харкава і Адэсы.

### ПАГРАЖАЎ САСКОЧЫЦЬ З ТРУБЫ ЦЭЦ

**Малады чалавек пагражаў саскочыць з тэхналагічнай трубы Светлагорскай ЦЭЦ.**

Па інфармацыі УУС Гомельскага аблвыканкама, інцыдэнт адбыўся раніцай. Кантралёр Светлагорскага аддзела Дэпартамента аховы ўбачыў чалавека, які ступае па трубах цеплатрасы ЦЭЦ, і націснуў кнопку трывожнай сігналізацыі. Невядомы быў выяўлены на прылеглай да Светлагорскай ЦЭЦ тэрыторыі. Ён хадзіў па тэхналагічных трубах парапровода на вышыні 6-8 метраў у бок ЦЭЦ і назад. Да месца здарэння накіраваўся нарад групы затрымання Светлагорскага аддзела Дэпартамента аховы. Крыху пазней прыбылі і супрацоўнікі Светлагорскага РАУС, медыкі і ратавальнікі з аўталесвіцай. Заклікі праваахоўнікаў спусціцца малады чалавек неадназначна ігнараваў, пагражаючы, што саскочыць уніз. Перагаворы доўжыліся каля 1,5 гадзіны. У працяглай гутарцы супрацоўнік групы затрымання аддзела аховы пераканаў маладога чалавека спусціцца. Пасля гэтага хлопец быў дастаўлены ў цэнтральную райбальніцу. Невядомы аказаўся работнікам аднаго з мясцовых прадпрыемстваў 1993 года нараджэння. Паводле папярэдняй інфармацыі, ён быў цвярозы.

### ПАЗЫЧАЎ БУЙНЫЯ СУМЫ ДЛЯ СТАВАК

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 34-гадовага мужчыну, які часта пазычаў грошы, а вяртаць іх не спяшаўся.**

Міліцыянеры ўстанавілі, што работнік аднаго з прадпрыемстваў у дзень атрымання зарплаты пазычаў на розных падставах у сваіх калег грашовыя сродкі. Неадназначна спасылаўся на тое, што яны патрэбныя то на рамонт машыны, то на лекі. Сумы браў ад 100 рублёў да 1700 долараў. На дадзены момант супрацоўнікам міліцыі вядома аб дзесяці пацярпелых. Як растлумачыў сам затрыманы, грошы ён траціў на стаўкі ў букмекерскіх канторах, паведамілі ў Партызанскім РУУС Мінска.

Заведзена крымінальная справа за махлярства, фігуранту можа пагражаць пакаранне ў выглядзе штрафу або папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або арышту, або абмежавання волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

### ТРОЙЧЫ КІДАЎСЯ НА РЭЙКІ

**Мінчанін тройчы кідаўся на рэйкі ў сталічным метро і застаўся жывы.**

Гэтую інфармацыю агучыў **старшы памочнік мінскага транспартнага пракурора Дзмітрый ДОЎГАЛЬ.** Усе тры выпадкі адбыліся ў адзін з мінулых выхадных дзён.

Прыкладна ў 14.30 мужчына, які з'яўляецца інвалідам, апынуўся на рэйках на станцыі метро «Спартыўная». Супрацоўнікі апаратыўна адключылі падачу электраэнергіі, вынеслі пасажыра і выклікалі «хуткую». Медыкі забралі яго ў бальніцу. Абследаваўшы, мінчаніна адпусцілі, паколькі цялесных пашкоджанняў у яго не было. Прыкладна праз дзве гадзіны на станцыі «Пятроўшчына» мужчына зноў апынуўся на рэйках, і яго зноў выцягнулі. Ён не быў траўмаваны цягніком. Выклікалі «хуткую». Пасля агляду ў бальніцы мужчыну зноў адпусцілі. Калі ён у 19.25 на станцыі «Каменная Горка» чарговы раз апынуўся на рэйках, стала відавочна, што з ім не ўсё ў парадку. Выклікалі псіхіятрычную брыгаду і павезлі ў РНПЦ псіхічнага здароўя. У гэты ж дзень яшчэ адзін мужчына спрабаваў кінуцца пад цягнік метро на станцыі «Трактарны завод», аднак яго своечасова ўтрымалі пасажыры. Мужчыну адвезлі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Запрашальнік

# ГІСТОРЫЯ СТАРЫХ АПТЭК




**Да 13 студзеня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, што ў сталіцы, можна акунуцца ў атмасферу лекавання і нават алхіміі, убачыўшы выстаўку «Аптэка ў старой сядзібе. Гісторыя фармацыі ў Мінску ў XVIII—XX стагоддзях», прысвечаную 270-годдзю аптэкі Яна Шэйбы.**

Гістарычна будынак на плошчы Свабоды, 15 (дзе цяпер размяшчаецца галерэя) вядомы з канца XVIII стагоддзя як гарадская сядзіба. У 1799 годзе першы гаспадар граф Міхаіл Пшаздзецкі прадаў дом за 40 тысяч польскіх злотых Андрэю і Ганне Станкевічам. Менавіта з імем Андрэя Станкевіча звязана «аптэчная» гісторыя сядзібы. Яшчэ ў 1782 годзе будучы гаспадар дома мешчанін Андрэй Станкевіч адкрыў у Мінску аптэку.

На выстаўцы прадстаўлена гісторыя аптэчнай справы сталіцы з канца XVIII стагоддзя. Экспануецца арыгінальны аптэчны посуд: шкляныя і парцалянавыя штанглазы, рэторты, перагонныя колбы; узоры лекавых раслін; аптэчныя сігнатуры, фірмовыя этыкеткі аптэкі № 88 у Траецкім прадмесці; кнігі па фармацэўтыцы; аптэчныя вагі; дакументы і фотаматэрыялы.

Выстаўка падрыхтавана супрацоўнікамі галерэі сумесна з прадпрыемствам «Белфармацыя», клубам па гісторыі фармацыі пры рэспубліканскім грамадскім аб'яднанні фармацэўтычных работнікаў «ФАРМАБЕЛ».

Варта дадаць, што ў дарэвалюцыйным Мінску аптэк таксама было нямала. З 1907 года ў сталіцы ў раёне цяперашняй вуліцы Фабрыцыуса працаваў шклозавод Батвінніка, які, у прыватнасці, пастаўляў аптэкам слоічкі, бутэлечкі. Пасля рэвалюцыі ён стаў шклозаводам «Пралетар». Адзін з будынкаў былой «гуты» захаваўся. Яго гісторыя цесна звязана з самой аптэкай, якая адкрылася ў Траецкім у 1987 годзе пасля рэстаўрацыі заходняй часткі прадмесця (кабінет гісторыі аптэчнай справы знаходзіцца па адрасе: Старажоўская, 3). А сам будынак аптэкі № 88, дзе ён размяшчаецца, уключаны ў рэестр гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Першапачаткова было прынята рашэнне зрабіць у ім не толькі установу па вырабе лекавых збораў і продажы лекаў, але і асветніцкі, папулярызатарскі аб'ект. Аформіць уваход, тамбур і гандлёвую залу ў стылі старадаўніх аптэк XVII стагоддзя запрасілі архітэктара Ілью Дзятлава, мастачак Аляксандру Дзятлаву і Вольгу Сазыкіну. Дзякуючы ім знешні выгляд і інтэр'ер аптэкі цяпер з'яўляюцца ўнікальнымі.

Эпоха

# ЧАС СТАНАЎЛЕННЯ

## НА ШЛЯХУ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**«Абвяшчэнне рэспублікі. Год 1919» — так называецца новая выстаўка, якая пачала працаваць у Нацыянальным архіве (месціцца ён у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але трапіць менавіта ў архіў можна далёка не кожнаму). На выстаўцы прадстаўлена больш за 100 арыгінальных дакументаў 1918—1919 гадоў, якія раскрываюць працэс станаўлення тагачаснай дзяржаўнасці. Першая сусветная вайна, Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, польска-савецкая вайна аказалі значны ўплыў на стварэнне беларускай рэспублікі. А 1 студзеня 1919 года была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь — адзін з важных этапаў сучаснай дзяржаўнасці.**




На выстаўцы прадстаўлены дакументы Беларускага нацыянальнага камісарыята, Маніфест аб абвяшчэнні ССРБ і стварэнні Часовага рабоча-сялянскага кіраўніцтва і шмат іншага. **Дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ** тлумачыць:



— Нам трэба шмат увагі аддаваць падзеям, звязаным з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці. Асаблівую цікавасць, безумоўна, выклікае найноўшы перыяд, час станаўлення менавіта беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Падаецца, пры падтрымцы архівістаў нам удаецца праз дакументальныя матэрыялы паказаць тое, наколькі гэта быў складаны, цяжкі працэс і колькі зрабілі для яго рэалізацыі прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху, прадстаўнікі савецкага кіраўніцтва. Яны надзвычай плённа папрацавалі дзеля станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Са свайго боку, як гісторык я перакананы, што нельга спрошчана глядзець на гэты працэс, на стварэнне савецкай дзяржаўнасці — маўляў, гэта была проста ініцыятыва з Масквы. Зараз, маючы магчымасць паглядзець на гістарычныя дакументы і матэрыялы, можна ўбачыць, якая велізарная праца была зроблена Беларускім нацыянальным камісарыятам, які дзейнічаў пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў РСФСР. Так, не ўсё было проста. Спачатку ўтварылі ССРБ, абвясціўшы гэта. Потым утварылі Беларуска-літоўскую ССР. І тут галоўную ролю адыгралі геапалітычныя стасункі, у якіх апынуліся рэспублікі. З гістарычных дакументаў мы бачым, што мясцовыя дзеячы, напрыклад Чарвякоў, працягвалі мэтанакіраваную работу па сцвярджэнні неабходнасці беларускай дзяржавы. Як вынік — тое, што адбылося ў ліпені 1920 года, — прынята дэкларацыя аб незалежнасці нашай краіны. Далей пачалося паступальнае развіццё беларускай савецкай дзяржаўнасці. Яно таксама ішло няпроста. Тэрыторыя ССРБ у выніку Рыжскага мірнага дагавора спачатку была абмежавана — засталося толькі 6 паветаў Мінскай губерні. Аднак адбыліся ўзбуйненні краіны ў 1924, 1926 гадах. У 1939 годзе адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, і для нас гэта быў акт гістарычнай справядлівасці.

Таксама на выстаўцы цікава будзе азнаёміцца з анкетамі некаторых бацькоў-заснавальнікаў нашай дзяржаўнасці таго часу — Змітра Жылуновіча, Алеся Чарвякова, успамінамі Язэпа Канчара і многіх іншых — тых, хто стаяў на чале беларускага палітычнага жыцця.

Сваімі словамі

# ПРОСТЫЯ РЭЧЫ. ПЛАСТЫКАВЫЯ ВОКНЫ



**Усё пачынаецца з невялікага, з нашага стаўлення да самых простых рэчаў. Ці ў стане мы ўлічыць дробязі, прыняць правільнае рашэнне, калі яно датычыцца чагосьці не відавочнага на першы погляд, але ад гэтага не менш важнага?..**

Зноў і зноў у розных месцах даводзіцца бачыць, як у гістарычна каштоўных будынкі ўстаўляюць... пластыкавыя вокны. Пэўна, калі ў доме яшчэ хтосьці жыве або, скажам, будынак выкарыстоўваецца як музей і ў ім працуюць людзі, яны напэўна ж будуць рады такому абнаўленню. Вецер не будзе больш дзьмуць у шчыліны, унутры стане спакайней і ўтульней. Але ж, як вядома, хоць і важна тое, што ўнутры, сустракаюць заўсёды па адзежы, па знешнім выглядзе.

Мне заўсёды бачыцца пэўны метафарызм у тым, як на зіму ў вясковых хатах устаўляюць падвойныя вокны. У нас на Валожыншчыне, дзе жыве бабуля, прастору паміж дзвюма рамамі заўсёды любілі ўпрыгожыць — пакласці слой ваты (быццам снег), а на ёй раскласці памаранчавыя званочкі-сухацветы з шарыкамі ўнутры, а таксама невялічкія навагодні цацкі. Атрымлівалася вельмі святочная кампазіцыя! Яна дадавала казачнага настрою, адразу адчувалася пераднавагодняя пара, сэрца і розум настройваліся на цуды... Але яшчэ больш сімвалічна тое, як вясной двайныя рамы вымаюць, пакідаючы толькі адну. Хоць і можа быць холадна, хоць гэта і крыху небяспечна — застаецца толькі тоненькая шыба. Затое акно прамываюць, прыбіраюць усё лішняе. Нібы расплюшчваюць вочы пасля зімовай спячкі. Прэч усё старое — наперадзе вясна і новае жыццё. Вокны — гэта вочы дома. А вочы павінны быць адкрытымі. Такі сімвалізм.

Тым больш балюча глядзець, як у старых мурах ці даволі крохкіх драўляных пабудовах пачынаюцьззяць бялюткія пластыкавыя вокны. Гэтыя вочы быццам чужыя зусім. Няма ў іх мудрасці, узважанасці і прыгажосці колішніх поглядаў дамоў... І іх нават не назавеш новымі моднымі акулярамі. Такім чынам хтосьці, не думаючы, быццам спрабуе змяніць душу дома. Але ж сэрца застаецца ранейшае.

Днямі ішла на работу па цэнтральнай сталічнай вуліцы і пабачыла гэта зноў... У будынку, які стаіць на праспекце Незалежнасці, адно за адным з'яўляюцца пластыкавыя вокны. Варта адзначыць, што сам будынак шэра-пясочнага колеру. На першым паверсе там месціцца кавярня. Я бачыла яе разоў з тысячу і вось толькі цяпер звярнула ўвагу на тое, што там таксама стаяць новыя вокны, аднак яны не ярка-белыя, а карычневыя і па форме зроблены дакладна на ўзор тых, што стаялі раней. Таму яны не выглядаюць наватворам і даволі арганічна ўспрымаюцца ў такім асяроддзі. А яшчэ дзівіць тое, што будынак, у якім адзін за адным пачынаюць запальвацца ярка-белыя вочы — гэта інтэрнат Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, у якім ёсць цэлы архітэктурны факультэт! Няўжо ніхто з выкладчыкаў, дасведчаных спецыялістаў ці нават студэнтаў не можа звярнуць увагу на такі «рамонт» і змяніць ход падзей? Калі мы не можам паўплываць нават на сваё, дык аб чым тады гаварыць?..

Побач, на праспекце, знаходзіцца адзін з будынкаў Дома друку. Я спецыяльна звярнула ўвагу, якія ў ім стаяць вокны. Туды ўсталёўны акуратныя шэрыя шклопакеты, зробленыя дакладна на ўзор ранейшых вокнаў — таму вокны і будынак глядзяцца цэласна.

І ўсё тое, пра што напісана вышэй, як той казаў, яшчэ паўбяды. Каб не два «але». Першае — сталічны праспект Незалежнасці з'яўляецца помнікам гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Другое — яго плануюць намінаваць на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Відавочна, што ўстаноўка ў дамы архітэктурнага ансамблю офісных вокнаў можа скараціць шанцы на ўнясенне ў спіс каштоўнасцяў чалавецтва. Не трэба быць вялікім спецыялістам, каб разумець гэта.



На жаль, не так рэдка даводзіцца бачыць ці чуць пра тое, што ў пэўны гістарычны будынак усталявалі новыя вокны, мімаходзь збілі ляпныя ўпрыгожанні, перафарбавалі і... выключылі са спіса каштоўнасцяў. Да болю простая, але дзейная схема, якая, на жаль, не працуе ў адваротны бок.

Што казаць, калі нават у старажытных адрэстаўраваных замках нашай краіны цяпер можна сустрэць пластыкавыя вокны! Але ж можна рабіць інакш. Як прыклад: у Любчанскім замку, які аднаўляе дабрачынны фонд на чале з Іванам Пячынскім, усталяваны драўляныя дубовыя вокны, пакрытыя цёмнай марылкай. Так, гэта выйшла даражэй, чым калі б ставіліся пластыкавыя. Аднак аўтэнтычнасць даражэйшая. І прастаяць такія вокны даўжэй, і ў цікаўных турыстаў не будзе адчування, што дзесьці іх падманулі.

Як ужо гаварылася вышэй, вокны — гэта вочы дамоў. Аднак праз навюткія шклопакеты нічога не праглядаецца. Такія вочы маўчаць. Ім няма чаго сказаць.

Матэрыялы падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

За кадрам




# ЯК ГУЧЫЦЬ КРАІНА

## На «Песні года Беларусі» артысты прызнаваліся ў любові да родных мясцін

**У мінулую пятніцу ў Мінску прайшоў заключны канцэрт «Песні года Беларусі»: больш як 30 айчынных артыстаў і калектываў, якія цягам усяго 2018-га найчасцей гучалі ў эфіры радыёстанцый, выступілі ў маштабнай зборнай праграме з песнямі і перадnавагоднімі віншаваннямі. Цікавінкай вечара стала прэзентацыя адмысловага праекта, прысвечанага малой Радзіме.**



Песня «Куточак Беларусі» ў выкананні Алены ЛАНСКОЙ дала назву альбому, які кампазітар Яўген АЛЕЙНІК і паэтка Юлія БЫКАВА *(гурт «Аўра»)* прысвяцілі Году малой радзімы.

Дзве тысячы білетаў у вялікую залу Палаца Рэспублікі разышліся літаральна за некалькі дзён, не без гонару адзначылі арганізатары. Некаторыя гледачы ў святочных уборах і з кветкамі прыйшлі паслухаць канкрэтных любімых артыстаў — Афанасьеву, Саладуху, а некаторым быў цікавы ўвесь канцэрт. «Адна справа, калі чуеш песню па радыё і думаеш: нічога так, падабаецца, а другая — убачыць, хто яе выконвае», — падзялілася пажылая сямейная пара. І хоць канцэрт зацягнуўся больш чым на 3,5 гадзіны, стомленасці ў публікі не адчувалася. Як відовішчна і ярка гэта было, можна пераканацца ў тэлеверсіі, якую канал АНТ пакажа 25 снежня. «Звязда» ж зазірнула за кулісы вялікага музычнага шоу, дзе вядучыя канцэрта Дзмітрый Кахно і Яўген Перлін пазіравалі перад камерамі, Аляксандр Саладуха ззяў фірменнай усмешкай і расказваў пра нядаўні канцэрт у Крамлі, дзяўчаты-танцоркі ў футурыстычных касцюмах разміналіся проста ў калідоры, а дыджэі радыёстанцый і шматлікія выканаўцы дысцыплінавана чакалі свайго выхаду на сцэну.

У спісе ўдзельнікаў заўважаем як заўсёднікаў «Песні года Беларусі», якія атрымліваюць памятныя дыпломы штогод, так і навічкоў: хто такія і як выглядаюць спявачкі Lilika, Кейсі, Даша Кола, дуэт «Двое ў горадзе», здаецца, ведаюць хіба рэжысёры канцэрта. Затое ўсе адразу пазнаюць спецыяльнага госця — заслужанага артыста Расіі Аляксея Глызіна, які, дарэчы, выканаў песню беларускага аўтара. «Не скажу, каб мне часта выпадала супрацоўнічаць з беларусамі, але кожны раз — памятны і радасны, бо гэта заўжды зроблена дасканала і шчыра, ад душы. Вось і цяпер мне вельмі прыемна працаваць з Лёнем (Шырыным. — **Аўт.**), які ўзначальвае прадзюсарскі цэнтр «Спамаш Малінаўка.by» і працягвае справу нашага агульнага добрага сябра Аляксандра Ціхановіча», — прызнаўся Глызін пасля выступлення і, ці то жартам, ці то ўсур'ёз, дадаў, што плануе набыць кватэру ў Смалявічах, каб часцей запісвацца і выступаць у нашай краіне.

Саліст «Драздоў» Віталь Карпанаў, высветліўшы нумар свайго выступлення, наадварот, нікуды не спяшаецца і з жартамі ды прыгаворкамі робіць усё новыя запісы для відэаблога. «Віталь, — падбухторваюць яго калегі, — у цябе ж песня пра вёску, чаму касцюм такі афіцыйны?» — «Ну, па-першае, я без гальштука, — знаходзіцца спявак, — а па-другое, калі пра вёску, то што, абавязкова ў ботах і штанах



Спецыяльны госць Аляксей ГЛЫЗІН зазначыў, што гатовы набыць кватэру ў Смалявічах, каб часцей запісвацца і выступаць у Мінску.

з начосам?» Нам жа прызнаецца, што цяпер у родных мясцінах бывае нячаста: «Вось заўтра паеду. І хоць складана гэта ўвязаць з гастрольным графікам, але зазірнуць да бацькоў і дапамагчы — няхай нават не самому, а наняць людзей — такі абавязковы абавязак, даруйце за таўталогію. І калі людзі, якія рэалізаваліся ў жыцці, часцей будуць ездзіць да сябе на малую радзіму і матываваць землякоў, то і яна будзе змяняцца да лепшага».

Аляксей Хлястоў дае закадравыя каментарыі выключна ў кампаніі дачкі Варвары, якая цвёрда трымае ў руках дыплом «Песні года». Дзяўчынка, дарэчы, таксама актыўна займаецца музыкай — так што яшчэ пытанне, хто каго суправаджае на канцэрце. «Усміхайся, дачушка, — падбадзёрвае спявак, — у таткі цяпер усё ёсць — і дыплом, і зарплата, так што будзем святкаваць». Усёй сям'ёй прыбылі на канцэрт і NaviBand: пакуль Ксенія і Арцём спяваюць, сямімесячны сын Мацей, здаецца, адчувае, што песня «А дзе жывеш ты?» — пра яго, і спакойна чакае бацькоў на руках то ў бабулі, то ў дырэктара гурта, а па сумяшчальніцтве свайго хроснага бацькі Аляксандра.

А вось народнаму артысту Беларусі Анатолю Ярмоленку даўно няма патрэбы даказваць камусьці якасць сваёй музыкі, таму ён смела пагаджаецца на эксперыменты. Напрыклад, выконвае разам з унукам, Анатолем Ярмоленкам-малодшым, забаўную песню на словы моднага аўтара Цімы Беларускіх «Ва ўсіх навідавоку», дзе... чытае рэп. Але звыклага і любімага Анатоля Іванавіча ў «Песні года Беларусі — 2018» гледачы таксама ўбачаць і пачуюць — з песняй «Сапраўдны беларус». «Мне прыемна, што тут ёсць беларускасць не ў традыцыйным разуменні слова, а ў сучасным гучанні — значыць, да гэтай тэмы, да нашай мовы і культуры ёсць цікавасць у наступнага пакалення», — разважае артыст.

«Дзяўчаты, дзяўчаты, Алейнік ідзе!» — у кампазітара, які сёння выглядае асабліва ўрачыста, ці не кожную пару хвілін просяць зрабіць сумеснае фота альбо даць міні-інтэрв'ю. Такая цікавасць не выпадковая: кампазітар Яўген Алейнік і паэтка Юлія Быкава прэзентуюць на «Песні года» цэлы праект — новы альбом «Куточак Беларусі», прысвечаны малой радзіме. Дзевяць песень з яго прагучалі і на канцэрце — у выкананні Іны Афанасьевай і Юліі Быкавай, Вікторыі Алешкі і Аляксандра Саладухі, Алены Ланской, Анатоля Ярмоленкі, Іскуі Абалян, Машы Жылінай, Андрэя Коласава і Дзяніса Вяршэнкі, а ўсяго ў зборніку 20 музычных кампазіцый. Увогуле, гаворыць Яўген Алейнік, адпраўным пунктам праекта можна назваць 2011 год — калі на міжнародным конкурсе «Еўрабачанне» прагучала песня «I love Belarus» у выкананні Анастасіі Віннікавай. У 2016-м нарадзілася песня «Сінявокая», якую выканалі дуэтам народны і заслужаная — Анатоль Ярмоленка і Вікторыя Алешка, — атрымалася без пафасу, затое душэўна



Анатоль ЯРМОЛЕНКА паказаўся публіцы ў розных вобразах.

і пранікнёна. Летась на Купаллі ў Александрыі Алена Ланская ўпершыню выканала песню «Куточак Беларусі», эфектны кліп на якую здымаўся цэлы год і быў прадстаўлены толькі гэтай восенню. А потым здарылася праца ў Кітаі, настальгія па Радзіме, і, нібыта пацеркі ў нітцы караляў, новыя песні адна за адной склаліся ў цэлы альбом. «Сёння адбываецца прэм'ера, але сам альбом яшчэ не выйшаў, засталося дарабіць некалькі песень, — дзеляцца аўтары. — Хочацца падзякаваць усім, хто падключыўся да праекта, — а гэта і заслужаныя артысты, і маладыя выканаўцы Анжаліка Пушнова, Оля Сацюк, Руслан Асланаў, Ален Хіт і іншыя, — і з вялізным імпэтам выконваюць лірычныя песні пра сваю малую радзіму, пра тое, што яны адчуваюць да роднай зямлі. І справа ніколькі не ў кан'юнктуры: наколькі мы можам меркаваць, Год малой радзімы насамрэч закрануў ва ўсіх нейкія стрункі ў душы, выклікаў жаданне зрабіць штосьці для родных мясцін». Як плануецца, альбом «Куточак Беларусі» будзе суправаджацца не толькі прыгожымі кліпамі, але і нотамі да кожнай песні, каб іх маглі выконваць усе ахвотныя (напрыклад, толькі партытуру «Сінявокай» папрасілі прыслаць больш як 50 чалавек).

Пра тое, што песні пра малую радзіму сталі для іх чымсьці значна большым, чым словы і мелодыя, расказалі «Звяздзе» і іншыя ўдзельнікі праекта. «Патрыятызм пачынаецца якраз з гэтага — з любові да пэўнага куточка Беларусі, які ў кожнага свой, — разважае Алена Ланская. — Для мяне гэта, напрыклад, родны Магілёў, дзе я нарадзілася і вырасла, дзе першы раз закахалася і пачала спяваць. І калі мы здымалі ў вёсцы кліп на песню «Куточак Беларусі», — немагчыма перадаць словамі ўсю палітру пачуццяў і эмоцый, якія я перажывала, бо ўсё дзяцінства якраз правяла ў вёсцы і не па чутках ведаю і яе хараство, і яе жыццё, і працу — як капаць бульбу і даіць кароў... Я і сёння стараюся як мага часцей прыязджаць у Магілёў: там засталіся сябры, мой тата і старэйшая сястрычка з пляменніцай і ўсе тыя людзі, якія памятаюць мяне яшчэ маленькай дзяўчынкай».

Для спявачкі Іскуі Абалян пытанне малой радзімы складанае: «Я армянка, але так склалася, што ў Арменіі ні дня не пражыла: нарадзілася ў Кыргызстане, вырасла ў Расіі, а з 19 гадоў жыву ў Беларусі, атрымала прафесію і заваявала свайго слухача ў Магілёве. Напэўна, ён і ёсць пункт адліку, мая любімая малая беларуская радзіма, дзе я стараюся бываць як мага часцей». Што да песні «Мама» з альбома, прысвечанага Году малой радзімы, то Іскуі прызнаецца: практычна кожны раз, калі выконвае яе, не можа стрымаць слёз — настолькі аўтабіяграфічнай, глыбокай і асабістай атрымалася кампазіцыя. «Я ўпэўнена, што песня пра родны дом, пра бацькоў нікога не пакіне абыякавым, — гаворыць Іскуі. — Сёння я ўпершыню адправіла яе сваёй сястры і маме. Доўгі час была цішыня — яны абедзве таксама проста плакалі і не маглі нічога сказаць... Значыць, атрымалася нешта сапраўднае, што ідзе ад сэрца да сэрца».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара і БелТА.**

# Беларуска — галоўная прыгажуня Еўропы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наогул, прадстаўніца нашай краіны задоўга да фіналу ў добрым сэнсе вылучалася сярод 118 сёлетніх канкурсантак. Так, Марыя ўвайшла ў 30 найлепшых на адборачным этапе «Топ-мадэль свету» і ў шасцёрку самых спартыўных удзельніц, а таксама зрабіла моцнае ўражанне ў конкурсе дабрачынных праектаў. А 8 снежня менавіта беларуску ў эфектным нацыянальным уборы рэжысёры фінальнага шоу паставілі адкрываць еўрапейскі блок «Танцаў свету».

Беларуску назвалі першай у спісе топ-30 фіналістак і ёй жа першай з усіх выпала падрабязней расказаць пра сябе і адказваць на пытанні. Але прыгажуня не разгубілася і, павітаўшы шматмільённую аўдыторыю тэлегледачоў на англійскай і кітайскай мовах, асобна дадала: «Прывітанне, Беларусь!» Наогул, у тым, як дзяўчына трымалася на сцэне, усё было да месца: і незвычай пяшчотная сукенка з пераліваннямі ад бірузовага да сіняга ад дызайнера Юліі Латушкінай, і адкрытая ўсмешка, і ўпэўненая англійская мова, і трапныя адказы на банальныя, але абавязковыя пытанні інтэлектуальнага раўнда... Словам, калі Беларусь назвалі ў топ-5 фіналістак, гэта было не знянацку, а нарэшце. Што толькі павялічвае наша захапленне Марыяй Васілевіч — дзеючай «Міс Беларусь», а цяпер яшчэ і «Міс свету Еўропа» 2018 года і гонар за яе. Дарэчы, дзяўчына паабяцала, што ніякая занятасць не перашкодзіць ёй працягваць праекты па падтрымцы, сацыяльнай адаптацыі і самарэалізацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Землякі гатовыя былі імчацца ў аэрапорт, сустракаць дзяўчыну з кветкамі і віншаваннямі яшчэ ўчора, але давядзецца крыху пачакаць. Як расказала сама Марыя ў сваім «Інстаграме», хоць яна за гэты месяц бязмежна засумавала па доме,



аднак паводле ўмоў конкурсу ўсе пяцёра фіналістак затрымаюцца ў Кітаі яшчэ на тыдзень і возьмуць удзел у дабрачынных мерапрыемствах.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота missworld.com.**

Перадсвяточнае

# СНЯГУРКА ПАД ПАРАСОНАМ

## Рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза адзначыла сваё 15-годдзе

**Трэба ж, у Белавежскай пушчы ў мінулую суботу ішоў дождж! Але гэта не стала перашкодай для свята. Тут хораша адзначылі 15-ы дзень нараджэння рэзідэнцыі Дзеда Мароза.**

Святочная праграма пачалася з прыбыцця казачнага цягніка. Ім прыехалі дзедавы дочкі — Сцюжа, Завея і Мяцеліца. Яны, як вядома, лета праводзяць на курорце, у халодных краінах, а зімой вяртаюцца ў пушчу. Але нашы гераіні дажджу не спужаліся ды актыўна ўключыліся ў святочныя флэш-мобы, у віктарыны, карагоды, іншыя забаўлянкі.

Сам жа казачны Дзед, як заўсёды, вітаў гасцей. Асабліва ён быў рады школьнікам і дашкольнікам. У малых наведвальнікаў распытваў пра іх поспехі ў вучобе, спорце, занятках у гуртках. А потым запрасіў усіх на адкрыццё першага ў свеце помніка Новаму году.



Фота БелТА.

Кампазіцыя гэтага аб'екта складаецца з цыферблата (на якім застыў час без дзвюх хвілін дванаццаць), посаха зімовага чараўніка, яго валёнак і рукавіц, ну і, вядома, мяшка з падарункамі. У гэтыя валёнкі, дарэчы, можна ўступіць, рукавіцу прымераць, патрымацца за дзедаў кій і загадаць жаданне. І тады яно абавязкова збудзецца. Нездарма ж памятны знак размясціўся каля галоўнай ёлкі рэзідэнцыі.

А дзедава ўнучка Снягурка хоць і хадзіла пад парасонам, ды была вясёлая і ўсмешлівая, запрашала ўсіх удзельнічаць у гуляннях, якія працягваліся цэлы дзень. Вечарам запаліліся агні навагодняй ёлкі, што стала пачаткам святочнай феерыі ў рэзідэнцыі.

У гэты дзень сядзібу наведала шмат турыстаў. Былі госці з усіх рэгіёнаў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. У найбліжэйшы час у рэзідэнцыі чакаюць яшчэ больш наведвальнікаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# КЛУБНІЦЫ БЕЗ НІТРАТАЎ І АГУРКІ БЕЗ ПЕСТЫЦЫДАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Важна ведаць, што сістэмы нейтралізацыі пестыцыдаў у прыродзе не існуе. Гэта і служыць прычынай таго, што многія сёння адмаўляюцца ад іх ужывання.

А пры арганічным спосабе вытворчасці не выкарыстоўваюцца хімічныя прэпараты, гармоны росту, антыбіётыкі і метады геннай інжынерыі. **Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН** лічыць, што вынік дасягаецца за кошт агратэхнічных прыёмаў, папярэджання ўзнікнення хвароб і распаўсюджвання шкоднікаў механічнымі і біялагічнымі метадамі.

У нашай краіне арганічная сельская гаспадарка знаходзіцца на пачатковым этапе. Вытворчасцю такой прадукцыі ў Беларусі займаюцца крыху больш за 20 суб'ектаў гаспадарання, уключаючы фермерскія і асабістыя дапаможныя гаспадаркі, сельскагаспадарчыя і іншыя арганізацыі амаль ва ўсіх абласцях краіны. Сем арганізацый акрэдытавана ў Еўрасаюзе па выдачы сертыфікатаў на вытворчасць арганічнай прадукцыі. Сертыфікавана каля 1,5 тысячы гектараў сельскагаспадарчых зямель.

### Экспартны патэнцыял

Плошча зямель у свеце для вытворчасці арганічнай прадукцыі павялічылася за 10 гадоў з 30,2 мільёна да 58 мільёнаў гектараў. Намеснік міністра адзначае, што аб'ём рэалізацыі арганічнай прадукцыі за гэты перыяд на сусветным рынку вырас да 90 мільярдаў долараў (павялічыўся ў два разы). Асаблівасцю гэтага сегмента з'яўляецца стабільна высокі рост (ад 10 % да 20 % у год). Згодна з экспертнымі ацэнкамі, да 2020 года міжнародны абарот арганічнай прадукцыі павялічыцца да 130 мільярдаў долараў.

У сусветным маштабе вядзецца актыўная работа па распрацоўцы і ўдасканаленні нарматыўна-прававога рэгулявання арганічнай вытворчасці.



Са 179 краін свету, якія ажыццяўляюць гэтую вытворчасць, 87 маюць адпаведныя законы, 17 краін знаходзяцца ў працэсе іх распрацоўкі, 20 маюць стандарты, але не маюць законаў. Сярод краін СНД па арганічнай сельскай гаспадарцы прынятыя законы ва Украіне, Казахстане, Малдове, Грузіі, Таджыкістане, Арменіі... і цяпер у Беларусі. Вытворчасць арганічнай прадукцыі нарошчваецца, і яна карыстаецца вялікім попытам. Мы можам забяспечыць сваё насельніцтва якаснай прадукцыяй і маем экспартны патэнцыял. Ужо ёсць заказы на такую агародніну з краін блізкага замежжа на сотні мільёнаў долараў.

### Попыт стварае прапанову

На пытанне, ці плануецца пастаўляць беларускую арганічную прадукцыю ў Кітай, Уладзімір Гракун адзначыў: «Экспарт будзе залежаць ад попыту. Па заяўцы КНР мы гатовыя яе пастаўляць. Але тут трэба абмяркоўваць, у якой менавіта прадукцыі і ў якіх аб'ёмах пастаўляць можа быць зацікаўлены Кітай, якія патрабаванні прад'яўляюцца на замежным рынку. Закон аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі ў нашай краіне ўступае ў сілу толькі праз год, ёсць час для абмеркавання».

Беларусь зацікаўлена ў пастаўках на экспарт. А для гэтага трэба, каб нашу прадукцыю лічылі экалагічна чыстай на сусветным узроўні. Цяпер разглядаецца пытанне аб уступленні ў Міжнародную федэрацыю арганічнага сельскагаспадарчага руху (IFOAM). «Гэта важна для прызнання нашых сертыфікатаў у свеце. Усю інфармацыю аб вытворчасці арганічнай прадукцыі мы стараемся ўніфікаваць у адпаведнасці з еўрапейскімі патрабаваннямі, каб можна было рабіць пастаўкі як на рынак краін ЕАЭС, так і на еўрапейскі», — сказаў Уладзімір Гракун.

### Спецыяльны знак «Арганічны прадукт»

Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі плануецца ўпаўнаважыць весці рэестр вытворцаў арганічнай прадукцыі, паведаміла **начальнік упраўлення ацэнкі адпаведнасці і ліцэнзавання Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Лізавета КАЗЛЕНКА.**

Законам уводзіцца добраахвотная сертыфікацыя арганічнай прадукцыі і працэсаў яе вытворчасці на адпаведнасць дзяржстандартам Беларусі і тэхнічным кодэксам устаноўленай практыкі. «Юрасобы, фізасобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія пройдуць сертыфікацыю прадукцыі па Нацыянальнай сістэме пацвярджэння адпаведнасці, будуць уключаны ў рэестр вытворцаў арганічнай прадукцыі. Фарміраванне рэестра ўскладзена законам на Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі. Рэестр павінен быць размешчаны на сайце Дзяржстандарта», — сказала Лізавета Казленка.

Сертыфікаваныя вытворцы атрымаюць права наносіць знак «Арганічны прадукт» на спажывецкую або транспартную ўпакоўку. Гэты знак можа выкарыстоўвацца пасля ўступлення закона ў сілу, гэта значыць, праз год. «Калі казаць пра агульныя падыходы, то на сёння сертыфікаты на прадукцыю выдаюцца тэрмінам на пяць гадоў. У гэты перыяд праводзяцца дзве перыядычныя ацэнкі: першая — праз 18 месяцаў пасля выдачы сертыфіката і ўступлення яго ў сілу, другая — не менш чым праз 18 месяцаў пасля першай», — растлумачыла прадстаўнік Дзяржстандарта.

### Эколагі толькі «за»

Арганічная вытворчасць дае цэлы шэраг дадатковых магчымасцяў для атрымання экалагічных, эканамічных і сацыяльных выгад. **На гэта звярнуў увагу намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Андрэй КУЗЬМІЧ.**

Правільна арганізаваная арганічная вытворчасць вядзе да аздараўлення стану навакольнага асяроддзя, памяншэння паступлення тэхнагенных хімічных рэчываў у глебу і далей у падземныя і паверхневыя воды. Гэтаму будуць спрыяць нормы прынятага закона «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі», паводле якіх пры вытворчасці такой агародніны і садавіны забараняецца ўжываць хімічныя ўгнаенні і сродкі аховы раслін, іншыя сінтэзаваныя хімічным шляхам сродкі.

У Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на перыяд да 2030 года ў якасці аднаго з галоўных крытэрыяў развіцця сельскай гаспадаркі прадугледжаны рост долі арганічных зямель у агульнай плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў да 3—4 %. Палажэнні аб неабходнасці развіцця вытворчасці арганічнай прадукцыі ўтрымліваюцца і ў дактрыне нацыянальнай харчовай бяспекі Беларусі да 2030 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СВАЁ ФУТРА ЦЯПЛЕЙ ДА ЦЕЛА

**Дызайн-цэнтр GNL Белспажыўсаюза прадставіў новую калекцыю футравых вырабаў у творчым супрацоўніцтве з Анжалікай Агурбаш.**

Як расказала сама спявачка, якая выступіла ў якасці дызайнеркі, 7 снежня калекцыя паехала на прэзентацыю ў Маскву.

Капсульная камерцыйная калекцыя «GNL by ANGELICA» запланавана на 2019—2020 год, але базавыя вырабы будуць з цягам часу трансфармавацца. У планах пашырэнне вытворчасці, таму што заказаў, па словах дызайнеркі, ужо вельмі шмат.

— У мяне дастаткова запрашэнняў на тыдні моды ў Расіі, Казахстане, краінах Балтыі. Зацікаўленасць вялікая, нават Філіп Кіркораў паклаў вока на некаторыя нашы вырабы і заказаў два футравыя капюшоны, — сказала Агурбаш.

Аб развіцці зверагадоўчых гаспадарак у краіне расказаў **старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Валерый ІВАНОЎ.**

— Больш за 90 % пушніны ў нашай краіне належыць Белспажыўсаюзу. З 500 тысяч шкур атрымліваецца 1000 вырабаў. Канешне, гэта малы аб'ём, але вырабы эксклюзіўныя, яны маюць высокую якасць. Мы плануем падвоіць вытворчасць і наладзіць партнёрства з кітайскімі і расійскімі інвестарамі, — падзяліўся Валерый Іваноў.

Па яго словах, каб замацавацца на адным узроўні з такімі канкурэнтнымі футравытворчымі краінамі свету, як Кітай, Расія, некаторыя прыбалтыйскія краіны, прадпрыемству быў патрэбны творчы штуршок. Таму дызайн-цэнтр GNL арганізаваў праект з Анжалікай Агурбаш.

Спявачка пазнаёмілася з кампаніяй на «Белагра-2017» і, па яе словах, была ўражаная якасцю мадэляў.

— Магу сказаць, што сёння беларускае футра абсалютна канкурэнтаздольнае на любых рынках. Яно нават атрымала прэмію «Saga Furs» (аўкцыённая кампанія, якая прапаноўвае прэміяльнае футра ў Еўропе. — **Аўт.**). У творчай майстэрні GNL мы аб'ядналі найлепшыя ідэі для калекцыі «GNL by ANGELICA», — расказала Анжаліка Агурбаш.

Яна таксама падзялілася некаторымі момантамі работы над калекцыяй.

— Паўгода я правяла на фабрыцы. Няведанне работы з футрам дазволіла мне адысці ад шаблонаў. Уся калекцыя ў нас аверсайз (свабоднага крою. — **Аўт.**) і унісекс. Гэта якасна, стыльна, эфектна і модна, і вельмі па-беларуску. Вы можаце ўбачыць




на вырабах нацыянальную сімволіку — гэта яе адметнасць, — падкрэсліла спявачка.

Па словах Анжалікі Агурбаш, хутка плануецца адкрыццё невялікай крамы, а таксама запуск Інстаграм-профілю з фатаграфіямі калекцыі.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

Карысны досвед

# НЕХТА ГУБЛЯЕ. А ХТО ЗНАХОДЗІЦЬ?

## Дзе шукаць рэчы, забытыя ў грамадскім транспарце

**Кожны з нас хоць раз у жыцці адчуваў сябе «машкай-разявашкай». Прычым досыць часта мы прымяраем на сябе гэтую ролю ў дарозе. Выходзім з вагона электрычкі ці душнага салона аўтобуса, з палёгкай уздыхаем, а пасля раптам разумеем: рэчы нашыя «ту-ту» — паехалі далей без нас. Куды звяртацца ў такой сітуацыі, высвятляла карэспандэнт "Звязды".**



### Усё вырашае хуткасць

— Калісьці ў транспартнікаў быў цэлы алгарытм па захаванні і вяртанні забытых рэчаў. Пры кожным парку і нават у дыспетчарскіх гарадскога транспарту меліся куточкі для «згубленых скарбаў». Яны папаўняліся пасля кожнай змены, — успамінае **намеснік гендырэктара «Мінсктранса» Віктар ТОЗІК.**

Сёння ў «бюро знаходак» савецкага ўзору няма неабходнасці. І не таму, што людзі перасталі забываць рэчы. Няўважлівых пасажыраў як раз стала больш. Аднак цяпер з развіццём тэхналогій сістэма працуе інакш.

У 2012 годзе ў «Мінсктрансе» з'явіўся адзіны Цэнтр кіравання рухам. Тут дыспетчары сочаць за грамадскім транспартам у рэжыме рэальнага часу. На вялізным маніторы бачна, якія аўтобусы, тралейбусы і трамваі спяшаюцца, якія спазняюцца, а якія ідуць дакладна па раскладзе. Але самае галоўнае — праз цэнтр можна звязацца з кожным кіроўцам па тэлефоне ці адправіць яму паведамленне. Апроч таго, яшчэ адна задача супрацоўнікаў цэнтра — прымаць званкі на «гарачую лінію» ад пасажыраў.

— У выпадках са згубленымі рэчамі трэба дзейнічаць хутка. Чым раней схаменяцеся і патэлефануеце дыспетчарам, тым больш шанцаў, што забытае знойдуць. Як толькі паступае званок, мы тут жа звязваемся з кіроўцам, апісваем страту. На прыпынку ён можа зазірнуць у салон і забраць рэч. Тут кожная хвілінка мае значэнне. На жаль, іншыя пасажыры могуць прысвоіць сабе чужое, — тлумачыць **галоўны дыспетчар «Мінсктранса» Святлана ЮШКО**. — Многія чакаюць вечара (а некаторыя і наступнага дня) і толькі тады пачынаюць пошукі. Але навошта цягнуць, калі забытую рэч цяпер можна перахапіць «на хаду»? Тым больш што практыка паказвае: да аўтапаркаў даязджае ў асноўным дробязь накшталт пальчаткі і парасонаў.

### 38 пашпартоў, «зменка» і «бомбы»

— Наконт пакінутых рэчаў нам тэлефануюць некалькі разоў на дзень. Пік «забыўчывасці» прыпадае на святочныя дні і верасень, калі ў сталіцу прыязджаюць тысячы навапечаных першакурснікаў, — расказвае **дыспетчар Ала РУБАНОВІЧ.** — Партрэт сярэднестатыстычнага «губліўца» скласці цяжка: гэта і дзеці, і студэнты, і маладыя матулі, і салідныя мужчыны ў касцюмах, і пенсіянеры. Пакідаюць усё, што вязуць: сумкі, кашалькі, прааўныя дакументы, адзенне... Моладзь забывае тэлефоны, планшэты і ноўтбукі. Як толькі ўмудраюцца? Здаецца, ні на імгненне іх з рук не выпускаюць, але ўсё адно пастаянна нам нанконт сваіх гаджэтаў тэлефануюць. Тое ж самае датычыцца курсавых і дыпломных: студэнты спяшаюцца на абарону і ў мітусні часта забываюць раздрукаваныя работы ў транспарце. Школьнікі быццам па прыкладзе старэйшых таксама любяць забыцца ў дарозе ранцы з кнігамі і сшыткамі, пакеты са спартыўнай формай. Не толькі вяртаюцца дадому, але і накіроўваюцца ў школу. І тут ужо закрадваецца сумненні: ці выпадковасць гэта?

На памяці ў дыспетчараў цэнтра нямала і больш сур'ёзных гісторый. Адна жанчына неяк пакінула ў аўтобусе сумку з некалькімі дзясяткамі пашпартоў, якія везла на атрыманне віз. На шчасце, страту хутка знайшлі, але ўладальніца ў той дзень ледзь не пасівела ад хвалявання. Яшчэ адзін небарака забыў новенькі тэлевізар. Прычым ён нават не памятаў, дзе гэта адбылося — у аўтобусе ці тралейбусе.

— Некалькі гадоў таму ў раёне Цэнтральнага аўтавакзала ў транспарце заўважылі падазроную дарожную сумку, з якой тырчалі правады. Гаспадара побач не было. Асабліва ўражлівыя пасажыры казалі, быццам нават чулі ціканне... — кажа Святлана Юшко, крыху панізіўшы голас. — Усе перапалохаліся не на жарт! Разам з міліцыяй выклікалі сапёрную брыгаду. А ўнутры аказаліся ўсяго толькі старыя разеткі, зламаныя электрапрыборы і г. д. Пэўна, нейкі электрык ехаў дадому з работы, ды і забыў у салоне сваё «багацце».

Напалохаць можа не толькі падазроная рэч, але і адны толькі словы пра яе.

— «Чаго вы тут седзіце, калі я ў аўтобусе саквояж пакінуў? Там, між іншым, бомба!» — пачула я аднойчы ў тэлефоннаю трубку, — успамінае Святлана. — Спачатку быў шок, а пасля я ўзяла сябе ў рукі і стала задаваць «тэрарысту» пытанні. Гады размоў з пасажырамі (а сярод іх сустракаюцца вельмі розныя людзі) навучылі мяне многаму. Мужчына ахвотна назваў сваё імя і паведаміў, па якім маршруце ідзе аўтобус з «бомбай». Мы тут жа звязаліся з усімі кіроўцамі, патэлефанавалі ў 102. І хоць пагрозы аказаліся фальшывымі, гора-«мінёру» прыйшлося заплаціць немаленькі штраф. Супрацоўнікі міліцыі забралі яго з уласнай кватэры «цёпленькім і п'яненькім».

Бывае, і самі кіроўцы папярэджваюць злачыннасць:

— Неяк жанчына забыла сумачку. Іншая запрыкмеціла безгаспадарную рэч, хацела прысвоіць яе сабе. Толькі пацягнула рукі — аўтобус рэзка спыніўся. Шафёр тут жа ўвайшоў у салон і забраў сумку: «Яна не ваша! Я ўсё бачыў у люстэрка». Дама пачала апраўдвацца, маўляў, я не аднойчы знаходзіла згубленае і заўсёды спрабую вярнуць яго ўладальнікам, пішу аб'явы ў газеты і г. д. Прыйшлося тлумачыць ёй, што ў нас свая сістэма вяртання.

### А як за МКАДам?

У рэгіёнах пасажыры часцей, чым у Мінску, запрыкмеціўшы безгаспадарную рэч, імкнуцца перадаць яе кіроўцу ці ўвогуле не чапаюць. Таму па прыездзе ў гараж салон сам па сабе можа нагадваць бюро знаходак.

— У такім выпадку знойдзенае апісваецца і застаецца ў аўтапарку ў чаканні ўладальніка. Пры гэтым, каб забраць рэч, недастаткова проста па яе прыехаць. Спатрэбіцца яе падрабязнае апісанне, — расказалі ў «Брэстаблаўтатрансе».

Вядома, у невялікіх гарадах такіх тэхналогій, як у сталіцы няма. Аднак схемы пошуку тут маюць пэўныя асаблівасці. Напрыклад, у Баранавічах пасля змены шафёры знаходзілі нават ноўтбукі. У аўтапарку яны не залежваюцца. Паколькі мясцовы народ, згубіўшы рэч, у першую чаргу звяртаецца не да дыспетчараў, а ў праваахоўныя органы.

**Ганна КУРАК.**

### Што рабіць, калі рэчы забытыя...

**❍ У АЎТОБУСЕ, ТРАЛЕЙБУСЕ, ТРАМВАІ**

Звоніце па нумарах «гарачай лініі» адразу, як толькі заўважыце прапажу. Майце на ўвазе, што прасцей адшукаць рэчы, калі пасажыр ведае нумар маршрута, дакладны час і прыпынак, на якім садзіўся. Дарэчы, у Мінску гэтая інфармацыя адбіваецца на талонах ў момант кампасціравання.

«Гарачая лінія» «Мінсктранса» — (017) 222-99-50.

У іншых гарадах напрамую звяртайцеся ў аўтапаркі.

**❍ У МЕТРО**

У падземцы згубленае два-тры дні захоўваюць на канцавых станцыях — «Каменная Горка», «Малінаўка», «Магілёўская» і «Уручча». Калі на працягу некалькіх дзён уладальнік не аб'яўляецца, знаходкі аддаюць у міліцыю.

Даведка метро па забытых рэчах — (017) 219-51-70.

**❍ У МАРШРУТЦЫ АБО ТАКСІ**

Усё проста — тэлефануйце дыспетчарам, у якіх замаўлялі машыну. Але і тут важна памятаць маршрут і дакладны час, калі вы ехалі.

**❍ У ЦЯГНІКУ**

Па правілах Беларускай чыгункі, усе забытыя рэчы асядаюць у камерах захоўвання канцавых станцый маршрута. Там знойдзенае ляжыць да 60 дзён, а пасля яго адпраўляюць на дарожны склад рэалізацыі, дзе камісія вырашае далейшы лёс рэчаў. Адпраўляючыся на вакзал па сваё дабро, не забудзьцеся прыхапіць з сабой пашпарт і грошы. За кожныя суткі захоўвання прыйдзецца заплаціць 79 капеек.

Камера захоўвання чыгуначнага вакзала Мінска — (017) 225-06-71.

**❍ У АЭРАПОРЦЕ**

Тут рэчы таксама трапляюць у багажнае аддзяленне. Праўда, знаходзяцца там да той пары, пакуль не прыйдзе гаспадар. Цана за «перастрымку» страты — амаль у пяць разоў перавышае чыгуначную.

Камера захоўвання нацыянальнага аэрапорта — (017) 279-10-53.

Калі пошук праз транспартныя службы аказаўся безвынікоым, звярніцеся па дапамогу ў інтэрнэт. На сайт www.buronahodak.by штодзённа дадаюцца дзясяткі новых аб'яў аб стратах і знаходках. Акрамя таго, ёсць сэнс зазірнуць на папулярныя форумы. У сацсетках можна зайсці ў суполкі і паблікі горада, дзе вы жывяце. Часам там размяшчаюцца запісы пра знойдзенае.

Май на ўвазе

# Дзед Мароз і Снягурка, гуляйце па-сумленнаму!

## Для такіх артыстаў стаўка — усяго толькі 92 рублі ў месяц



**Набліжаюцца Новы год і Каляды. Для ўсіх зімовыя святы — гэта час цудаў, час казачных герояў. І як жа без Дзеда Мароза і Снягуркі? Падчас навагодніх свят яны карыстаюцца асаблівым попытам. Дзядуля і яго ўнучка частыя госці ў людзей, ды і ў арганізацыях.**

Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску напярэдадні навагодніх свят рэкамендуе «гуляць — па-сумленнаму». Грамадзянам, якія хочуць зарабіць на навагоднім настрої, трэба заплаціць адзіны падатак і толькі потым адпраўляцца на ранішнікі, вечарынкі і карпаратывы.

Таксама ў цяперашні час такімі відамі дзейнасці, як:

музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў;

дзейнасць акцёраў, танцораў, музыкаў, выканаўцаў размоўнага жанру, якія выступаюць індывідуальна;

аказанне паслуг тамадой;

дзейнасць, звязаная з віншаваннем з днём нараджэння, Новым годам і іншымі святамі, незалежна ад месца іх правядзення;

фотаздымка, выраб фатаграфій;

відэаздымка,

грамадзяне могуць займацца без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка пры ўмове самастойнага ажыццяўлення дзейнасці без прыцягнення іншых фізічных асоб па працоўных дагаворах. Але да пачатку аказання паслуг трэба звярнуцца ў падатковы орган па месцы жыхарства з паведамленнем, паказаўшы ў ім від дзейнасці, перыяд занятку і месца яго ажыццяўлення. Потым неабходна стаць на ўлік у падатковым органе і заплаціць адзіны падатак (да пачатку аказання паслуг) за той перыяд (месяц), у якім будзе ажыццяўляцца дзейнасць.

У горадзе Мінску стаўкі адзінага падатку ўстаноўлены рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. У цяперашні час стаўка адзінага падатку для фізічных асоб у месяц па відах дзейнасці складае: музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў; дзейнасць акцёраў, танцораў, музыкаў, выканаўцаў размоўнага жанру, якія выступаюць індывідуальна; аказанне паслуг тамадой; арганізацыя пахаванняў і аказанне звязаных з імі паслуг; дзейнасць, звязаная з віншаваннем з днём нараджэння, **Новым годам і іншымі святамі, незалежна ад месца іх правядзення, — 92,0 рубля**, фотаздымка, выраб фатаграфій — 110,0 рубля, відэаздымка падзей — 126,0 рубля.

Занятак нелегальнай дзейнасцю прадугледжвае адказнасць. Так, за няўплату або няпоўную аплату адзінага падатку пры аказанні гэтых відаў паслуг фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прымяняюцца меры адміністрацыйнага ўздзеяння ў выглядзе штрафу. Падрабязную інфармацыю па пытанні аплаты адзінага падатку фізічнымі асобамі можна атрымаць у інспекцыі МПЗ па месцы жыхарства (рэгістрацыі) альбо па тэлефонах: 189 (стацыянарная сетка), 229-79-79.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# РАСКЛАД РУХУ



## ЦЯГНІКОЎ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ЛІНІЙ ЭКАНОМКЛАСА І ЦЯГНІКОЎ ГАРАДСКІХ ЛІНІЙ з 9 снежня 2018 года

### ▶ На Маладзечна, Гудагай

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна | 00-45 | 02-25 | штодзень | б/п Татаршчызна, Селівонаўка |
| Гудагай | 04-40 | 07-39 | штодзень | б/п Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі |
| Маладзечна | 05-26 | 07-10 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 05-50 | 06-24 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 06-10 | 06-44 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 06-25 | 09-55 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 06-40 | 07-14 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 07-23 | 09-25 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 07-45 | 08-19 | штодзень | усюды |
| Олехновичи | 08-01 | 09-21 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 08-18 | 08-54 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 08-35 | 09-09 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 08-48 | 10-46 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 09-25 | 09-59 | штодзень | усюды |
| Солы | 09-46 | 13-06 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 10-50 | 11-24 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 11-17 | 13-02 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 11-17 | 14-30 | па суботах, нядзелях | усюды |
| Беларусь | 11-35 | 12-09 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 12-05 | 12-39 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 12-30 | 13-04 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 12-59 | 14-44 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 13-30 | 14-04 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 14-06 | 17-28 | штодзень | б/п Селівонаўка |
| Беларусь | 15-00 | 15-34 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 15-38 | 17-24 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 16-00 | 16-34 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 16-22 | 19-34 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 16-45 | 17-19 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-25 | 18-03 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 17-34 | 19-19 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-50 | 18-24 | штодзень | усюды |
| Гудагай (паскораны) | 18-11 | 20-40 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Паўночны, Масюкоўшчына, Лебядзіны, Ждановічы, Фестывальны, ст. Маладзечна, Пруды, Заскавічы, Залессе, Маладзёжны, Смаргонь, Солы, Ашмяны, Каменка |
| Гудагай | 18-18 | 21-57 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 18-40 | 19-15 | штодзень | усюды |
| Солы | 19-17 | 22-15 | штодзень | да ст. Маладзечна з усімі прыпынкамі, ад ст. Маладзечна з прыпынкамі: Пруды, Заскавічы, Залессе, Маладзёжны, Смаргонь |
| Беларусь | 19-45 | 20-19 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 20-23 | 20-58 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 20-44 | 22-28 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 22-15 | 23-57 | штодзень | б/п Татаршчызна, Селівонаўка |

**Адпраўленне з п.п. МІНСК-ПАЎНОЧНЫ**

| Станцыя прызначэння | Адпраўленне з п.п. Мінск-Паўночны | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна (паскораны) | 05-24 | 06-53 | штодзень | б/п Мінскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы |

### ▶ З Маладзечна

**Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна | 04-15 | 06-00 | штодзень | б/п Селівонаўка |
| Беларусь | 05-49 | 06-24 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 05-11 | 06-58 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 06-37 | 07-13 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 05-34 | 07-22 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 04-21 | 07-34 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 07-25 | 08-00 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 07-37 | 08-12 | штодзень | усюды |
| Маладзечна (паскораны) | 07-14 | 08-28 | штодзень | з прыпынкамі: Фестывальны, Ждановічы, Лебядзіны, Масюкоўшчына, Мінск-Паўночны |
| Маладзечна | 06-47 | 08-44 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 08-36 | 09-11 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 06-00 | 09-22 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 09-03 | 09-38 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 09-45 | 10-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 09-11 | 11-08 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 10-40 | 11-15 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 08-33 | 11-29 | штодзень | б/п Раманы, Пралескі, Вязынка, Анусіна, Хмелеўка, Зялёнае, Мінскае мора |
| Аляхновічы | 10-41 | 11-58 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 11-45 | 12-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 10-55 | 12-40 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 12-35 | 13-10 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 13-05 | 13-40 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 13-45 | 14-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 13-03 | 14-50 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 14-37 | 15-12 | штодзень | усюды |
| Солы | 13-35 | 16-40 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 16-25 | 17-00 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-15 | 17-50 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 16-13 | 18-00 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-35 | 18-10 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 16-47 | 18-34 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 15-22 | 18-34 | па суботах, нядзелях | усюды |
| Беларусь | 18-15 | 18-50 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 17-28 | 19-27 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 19-08 | 19-43 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 20-01 | 20-36 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 17-47 | 21-07 | штодзень | усюды |
| Маладзечна (паскораны) | 19-50 | 21-17 | штодзень | б/п Селівонаўка, Крыніца, Татаршчызна, Мясата, Ласі, Баяры, Раманы, Пралескі, Вязынка, Анусіна, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка, Мінскае мора |
| Беларусь | 20-50 | 21-25 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 21-15 | 21-49 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 20-33 | 22-27 | штодзень | усюды |
| Гудагай (паскораны) | 20-03 | 22-43 | штодзень | з прыпынкамі: Каменка, Ашмяны, Солы, Гаўці, Смаргонь, Маладзёжны, Залессе, Заскавічы, Пруды, Маладзечна, Фестывальны, Ждановічы, Лебядзіны, Масюкоўшчына, Мінск-Паўночны |
| Гудагай | 21-06 | 00-01 | штодзень | б/п Скрэцыны, Гаўці, Беласельскі, Заскавічы, Мароські, Асаноўскі, Раманы, Пралескі, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка |

### ▶ На Асіповічы

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Пухавічы | 00-51 | 02-05 | штодзень | б/п Вяндзеж, Тэхнікум |
| Асіповічы | 05-11 | 07-12 | штодзень | б/п Чыгуначны |
| Рудзенск | 05-50 | 06-38 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 06-11 | 08-22 | штодзень | б/п Чыгуначны, Вярхі |
| Асіповічы | 06-46 | 09-04 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 07-24 | 08-12 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 07-54 | 09-11 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 08-15 | 09-03 | штодзень | усюды |
| Асіповічы (паскораны) | 08-27 | 10-07 | штодзень | з усімі прыпынкамі да ст. Міханавічы, далей з прыпынкамі на станцыях Рудзенск, Пухавічы, Талька, Вярэйцы |
| Асіповічы | 08-56 | 11-00 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 10-07 | 12-26 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 12-58 | 13-46 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 13-32 | 15-39 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 13-48 | 14-36 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 14-20 | 16-36 | штодзень | усюды |
| Жлобин | 15-20 | 20-34 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 16-05 | 18-43 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 16-35 | 17-23 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 17-25 | 18-13 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 17-40 | 19-52 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 18-22 | 20-38 | штодзень | б/п Вярхі |
| Асіповічы | 19-18 | 21-33 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 20-05 | 21-22 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 20-55 | 22-58 | штодзень | б/п Вярхі |
| Рудзенск | 21-30 | 22-18 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 22-49 | 00-04 | штодзень | б/п Вяндзеж |

**Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ**

| Станцыя прызначэння | Адпраўленне з п.п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы | 12-28 | 14-32 | штодзень | усюды |

### ▶ З Асіповіч

**Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Пухавічы | 04-53 | 06-10 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 05-42 | 06-59 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 06-19 | 07-07 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Асіповічы | 05-20 | 07-22 | штодзень | б/п Вярхі |
| Пухавічы | 06-18 | 07-35 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Рудзенск | 06-54 | 07-42 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 05-58 | 08-10 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 06-56 | 08-26 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Рудзенск | 08-25 | 09-13 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 07-33 | 09-36 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 10-45 | 11-33 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 11-15 | 13-20 | штодзень | б/п Вярхі |
| Асіповічы | 12-17 | 14-33 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 13-57 | 14-45 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 15-30 | 16-18 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 15-10 | 17-23 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 15-40 | 17-54 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 16-25 | 18-39 | штодзень | б/п Вярхі |
| Рудзенск | 18-00 | 18-48 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 17-17 | 19-30 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 19-11 | 19-59 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 18-14 | 20-17 | штодзень | б/п Вярхі |
| Асіповічы | 19-11 | 21-14 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 20-07 | 22-11 | штодзень | б/п Вярхі, Вяндзеж, Новае Сяло, Чыгуначны |
| Пухавічы | 21-44 | 23-08 | штодзень | усюды |

**Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ**

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы (паскораны) | 08-26 | 10-28 | штодзень | б/п Вярхі, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Велянскі, Тэхнікум Вяндзеж, Дрычын, Новае Сяло |
| Пухавічы | 11-23 | 12-43 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 13-58 | 16-03 | штодзень | усюды |

## На Стоўбцы, Баранавічы

### Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Баранавічы | 00-52 | 02-59 | штодзень | б/п Сталічны, Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды, Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Пагарэльцы, Юшкевічы, Крошын, Альсевічы, Пост 1 |
| Баранавічы | 04-31 | 06-58 | штодзень | б/п Сталічны, Пціч, Воўчкавічы, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 05-04 | 06-21 | штодзень | б/п Сталічны, Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 05-48 | 07-34 | штодзень | б/п Сталічны |
| Баранавічы | 08-17 | 11-10 | штодзень | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча, Ліпа, Альсевічы |
| Стоўбцы | 17-48 | 19-34 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 20-41 | 23-25 | штодзень | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Ліпа, Юшкевічы, Альсевічы |
| Стоўбцы | 21-35 | 23-20 | штодзень | б/п Сталічны |
| Стоўбцы | 22-20 | 23-57 | штодзень | б/п Сталічны |

### Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення з п.п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Баранавічы | 07-13 | 10-00 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 08-54 | 11-46 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Стоўбцы | 08-54 | 10-28 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 09-47 | 11-20 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Баранавічы | 09-47 | 12-29 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Баранавічы | 11-14 | 14-06 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 12-51 | 14-27 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 13-41 | 16-39 | штодзень | усюды |
| Гарадзея | 14-34 | 16-42 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 15-50 | 17-35 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 16-24 | 19-06 | штодзень | б/п Асіна, Мезінаўка, Кучкуны |
| Баранавічы | 17-10 | 20-26 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 18-37 | 21-42 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 19-57 | 21-38 | штодзень | усюды |

## З Баранавіч

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Стоўбцы | 04-13 | 05-51 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 05-36 | 07-12 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 08-19 | 10-04 | штодзень | б/п Цёмныя Ляды, Мезінаўка, Асіна |
| Стоўбцы | 15-33 | 17-21 | штодзень | усюды |
| Гарадзея | 17-12 | 19-14 | штодзень | б/п Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява |
| Баранавічы | 17-36 | 20-30 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 20-15 | 22-02 | штодзень | усюды |
| Баранавічы (паскораны) | 22-12 | 0-24 | штодзень | з прыпынкамі: Гарадзея, Стоўбцы, Коласава, Негарэлае, Койданава, Фаніпаль, Рошча, Курасоўшчына, Сталічны |

### Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Стоўбцы | 05-14 | 06-49 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 04-57 | 07-36 | штодзень | б/п Пост 1, Юшкевічы, Ліпа, Кучкуны, Адцэда |
| Стоўбцы | 06-41 | 08-25 | штодзень | усюды |
| Баранавічы (паскораны) | 06-22 | 08-43 | штодзень | б/п Альсевічы, Крошын, Юшкевічы, Ліпа, Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява, Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч |
| Баранавічы | 07-42 | 10-20 | штодзень | б/п Кучкуны, Адцэда, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч |
| Баранавічы | 08-20 | 11-25 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 12-04 | 13-40 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 12-36 | 14-11 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Баранавічы | 11-37 | 14-11 | з пятніцы па нядзелю | б/п Ліпа, Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява, Сталічны |
| Баранавічы | 13-07 | 15-49 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 14-57 | 17-58 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 16-01 | 18-33 | штодзень | б/п Ліпа, Асіпаўшчына, Сінява, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна |
| Стоўбцы | 19-15 | 21-01 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 20-28 | 23-19 | штодзень | б/п Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Бярэжа |

## На Барысаў, Оршу

### Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 00-24 | 02-12 | штодзень | б/п Дамашаны, Барсукі, Пралетарская Перамога |
| Орша | 04-49 | 08-39 | штодзень | б/п Слабада, Дамашаны, Загор'е, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў (паскораны) | 05-20 | 06-40 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 07-14 | 08-08 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 08-47 | 10-11 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 09-35 | 10-28 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 11-58 | 13-22 | з пятніцы па нядзелю | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 13-29 | 14-22 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 16-53 | 18-14 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Барысаў | 17-07 | 18-48 | штодзень | усюды |
| Смалявічы | 18-05 | 18-59 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 21-45 | 22-58 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Смалявічы, Зарэчнае, Жодзіна-Паўднёвае, Печынскі |

### Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення з п.п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Орша | 06-43 | 10-57 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 07-47 | 09-30 | штодзень | усюды |
| Орша | 14-44 | 18-48 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 17-40 | 19-23 | штодзень | усюды |
| Орша | 18-52 | 23-05 | штодзень | б/п Выдзершчына, Пераналачны, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў | 19-38 | 21-33 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 20-29 | 22-14 | штодзень | усюды |

### Адпраўленне са станцыі МІНСК-УСХОДНІ

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Усходні | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Крупкі | 05-52 | 08-15 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 09-03 | 10-37 | штодзень | усюды |
| Орша | 10-35 | 14-40 | штодзень | усюды |
| Орша | 13-10 | 16-58 | штодзень | усюды |
| Орша | 15-50 | 20-02 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 22-30 | 00-03 | штодзень | усюды |

## З Оршы

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Смалявічы | 06-08 | 07-06 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 06-30 | 07-47 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Зарэчнае, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Барысаў | 07-20 | 08-20 | штодзень | усюды |
| Орша (паскораны) | 05-04 | 08-28 | штодзень | б/п Харaброва, Веравойша, Ламачына, Сонечны, Дзятлава, Галашоўка, Пераналачны, Выдзершчына, Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е, Дамашаны, Слабада, Гарадзішча, Садовы, Калодзішчы, Азярышча |
| Смалявічы | 08-17 | 09-12 | штодзень | усюды |
| Смалявічы | 10-45 | 11-41 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 10-29 | 11-54 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Барысаў (паскораны) | 14-22 | 15-48 | з пятніцы па нядзелю | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Смалявічы | 15-10 | 16-05 | штодзень | усюды |
| Орша | 12-43 | 16-40 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 19-02 | 20-29 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Смалявічы | 19-52 | 20-51 | штодзень | усюды |
| Орша | 20-19 | 00-49 | штодзень | б/п Пралетарская Перамога, Барсукі, Дамашаны, Слабада, Садовы |

### Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Пачатковая станцыя | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 04-25 | 06-09 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 05-05 | 07-01 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 07-07 | 09-02 | штодзень | усюды |
| Орша | 08-55 | 12-55 | штодзень | усюды |
| Орша | 13-47 | 18-02 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 17-16 | 18-43 | штодзень | б/п Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е, Дамашаны, Слабада, Гарадзішча, Садовы, Калодзішчы, Азярышча |
| Орша | 15-16 | 19-36 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 19-25 | 21-11 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 20-33 | 22-21 | штодзень | усюды |

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-УСХОДНІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Усходні | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 05-36 | 07-13 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Орша | 05-44 | 10-06 | штодзень | усюды |
| Крупкі | 08-33 | 11-00 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Орша | 17-26 | 21-42 | штодзень | б/п Трацілава, Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е |

– цягнік гарадскіх ліній

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Торговое унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 62, каб. 215 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
**Местоположение – г. Минск, пер. Велосипедный 2-й, 30**

| Наименование | Назначение | Общ. пл., кв. м | Инв. номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|---|
| **Здание административного корпуса** (лит. Д 3/К) | Здание административно-хозяйственное | 2196 | 500/С-21404 | 30 |
| **Здание административно-бытового корпуса** (лит. З 7/К) | | 3349 | 500/С-29347 | 30/1 |
| **Склад** (лит. И 1/к) | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 3213 | 500/С-29336 | 30/2 |
| **Склад** (лит. В 2/к) | | 2898 | 500/С-19967 | 30/4 |
| **Здание склада** (лит. Г 1/К) | | 1346 | 500/С-16715 | 30/5 |
| **Здание посылочного корпуса** (лит. Е1/к) | Здание неустановленного назначения | 4888 | 500/С-22147 | 30/3 |

***В состав лота входит следующее имущество:*** транспортная проходная – инв. № 00000309В, туалет подземный и гаражи – инв. № 00000392В, ангар – инв. № 0000093В, гараж на 2 легковых автомобиля – инв. № 00731002В, подпорные стены бетонные – инв. № 00000011В и инв. № 00000388В, ограды ж/бетонные – инв. № 0000019В и инв. № 00000606В, ограда кирпичная – инв. № 00000020В, подпорная стена и цветочница – инв. № 00000597В, тротуар из плит перед зданием АБК – инв. № 00730981В, ворота въездные металлические транспорт. проходная – инв. № 00731169В, верхнее покрытие асфальтовое – инв. № 00000596В, ворота распашные 2-створчатые въезд возле юв. склада – инв. № 00731245В, наружные электросети – инв. № 00000013В и инв. № 00000594В, наружный газопровод – инв. № 00000014В, наружные сети водопровода – инв. № 00000015В и инв. № 00000598В, наружные сети теплотрассы – инв. № 00000016В, канализация – инв. № 00000094В и инв. № 00000599В, теплотрасса с теплопунктом – инв. № 00000389В, линии радио и телефон – инв. № 00000583В, ворота 3950*3000 ral 8014 (вход во двор) – инв. № 9В12413, гибкий неон (иллюминация световая здания) – инв. № 9В12464, турникет-привод «BRAVO» нержавейка+комплект системы контроля доступа (вход на территорию) – инв. № 10000064, оборудование трансформаторных станций – инв. № 00000156В

**Сведения о земельном участке: пл. 2.4462** га предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания специализированного транспорта, административного здания, зданий складов, здания посылочного корпуса, здания АКБ с корпусом ВЦ, здания высотного склада

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банков. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена с НДС 20 % – 23 958 750,00 бел. руб.**

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 (десяти) рабочих дней** после регистрации продавцом составных частей предмета аукциона в установленном законодательством РБ порядке

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 15.01.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.01.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

**Продавец:** ОАО «Витебский хозторг» г. Витебск, ул. Лазо, 110, тел. 8 (0212) 55-10-49

Лот № 1. Автомобиль «ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР», грузопассажирский, вагон, год выпуска – 1993, кузов (рама) № WV2ZZZ70ZPH117145, регистрационный знак АА 3370-2. **Начальная цена**: 1 602,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 160,20 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 11.01.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 11.12.2018 с 8.30 по 10.01.2019 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 14 (четырнадцать) дней со дня проведения аукциона, оплата объекта производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке объектов продажи, оплата НДС сверх цены продажи объекта

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Предмет аукциона расположен по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, 110. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (продавец)

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Вознаграждение от цены продажи лота, % |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Гидравлические ножницы с ЧПУ мод. HGD 4100x13 Ermaksan, инв. № КТ50000324 | 54 335,00 | 603,72 | 1 |
| Лот № 4 | Компрессор CSC 40/8, инв. № КТ54605 | 8 456,00 | 469,80 | 6 |
| Лот № 5 | Компрессор CSC 40/8, инв. № КТ54905 | 8 456,00 | 469,80 | 6 |
| Лот № 6 | Пресс листогибочный гидравлический с ЧПУ мод. CNC AP 4100-220, инв. № КТ50000260 | 116 640,00 | 1296,00 | 1 |
| Лот № 7 | Кран опорный электрический однобалочный управляемый с пола, инв. № КТ54805 | 4 471,00 | 496,80 | 12 |
| Лот № 8 | Кран опорный электрический однобалочный управляемый с пола, инв. № КТ54806 | 4 471,00 | 496,80 | 12 |
| Лот № 9 | Ленточно-шлифовальный станок GARBOLIод. LPC 300 WET, инв. № КТ55001 | 20 704,00 | 690,12 | 4 |
| Лот № 10 | Мармит-стол раздаточный ВХ 31, инв. № КТ50000329 | 1 264,00 | 280,80 | 25 |
| Лот № 14 | Мех. база сверлильно-фрезерно-расточного станка с ЧПУ мод. 2206ВМФ4, инв. № КТ49605; Станок фрез-расточ 2206 ВМФ4-03 без мехбазы (м/б Александрийская), инв. № КТ00020818 | 26 730,00 | 594,00 | 2 |
| Лот № 15 | Станок круглошлифовальный 3У131 м, инв. № КТ00020125 | 3 694,00 | 410,40 | 15 |
| Лот № 16 | Ножницы Н42, инв. № КТ00071083 | 3 013,00 | 502,20 | 18 |
| Лот № 17 | Полуавтомат трубогибочный дорновый станок с ЧПУ ERCOLINA мод. ТВ-76-ANIMA + комплект оснастки, инв. № КТ55000 | 49 378,00 | 548,64 | 1 |
| Лот № 18 | Посудомоечная машина AQUA 50 промышленная, инв. № КТ50000326 | 1 069,00 | 237,60 | 25 |
| Лот № 19 | Пресс гидравлический П-63286, инв. № КТ00020257 | 4 374,00 | 486,00 | 12 |
| Лот № 20 | Пресс листогибочный гидравлический, инв. № КТ50000224 | 7 193,00 | 639,36 | 10 |

Местонахождение Лотов: г. Минск, ул. Ангарская, 17

**Аукцион состоится 22.12.2018 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», проводимом 22.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 20.12.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.10.2018 г.

**Организатор аукциона, тел.: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (продавец). Местонахождение Лотов: г. Минск, ул. Ангарская, 17

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Вознаграждение, % от цены продажи |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 43 | Станок прод-фрез 6М612МФ4. Инв. № КТ00020826 | 161 352,00 | 1 792,80 | 1 |
| Лот № 46 | 1. Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966). Инв. № КТ1520344. 2. Станок свер-фр-раст с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б № 1520344). Инв. № КТ00020966 | 12 247,00 | 680,40 | 5 |
| Лот № 48 | Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22. Инв. № КТ55004 | 17 302,00 | 576,72 | 3 |
| Лот № 49 | Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22. Инв. № КТ55002 | 17 302,00 | 576,72 | 3 |
| Лот № 51 | Станок точил.-шлифовой 3к-634. Инв. № КТ00020280 | 1 069,00 | 237,60 | 25 |
| Лот № 52 | Станок унив.-заточ. 3В642. Инв. № КТ00020362 | 1 750,00 | 388,80 | 20 |
| Лот № 53 | 1. Стол раздаточный SXN 1000x700x900. Инв. № КТ50000336. 2. Стол раздаточный SXN 1000x700x900. Инв. № КТ50000337. 3. Стол раздаточный SXN 1100x700x900 мм. Инв. № КТ50000327 | 2 307,00 | 384,30 | 18 |
| Лот № 54 | Токарно-винторезный станок мод. 16ВТ20П-21. Инв. № КТ55524 | 12 053,00 | 669,60 | 6 |
| Лот № 55 | Универсальный поворотный делительный стол с УЦИ4. Инв. № КТ25000 | 10 692,00 | 594,00 | 5 |
| Лот № 56 | Фильтровентиляционный агрегат ФВА 1200УК передвижной. Инв. № КТ50000279 | 1 847,00 | 410,40 | 20 |
| Лот № 57 | Машина трубогибочная мод. ИВ3429. Инв. № КТ49405 | 4 957,00 | 550,80 | 10 |
| Лот № 58 | Пресс гибочный гидравлический 2-стоечный ПГГ-2. Инв. № КТ50000257 | 1 264,00 | 280,80 | 25 |
| Лот № 59 | Пресс гидравлический П-6328-6/у. Инв. № КТ50000285 | 4 471,00 | 496,80 | 12 |
| Лот № 60 | Станок ИВ3429. Инв. № КТ50000274 | 3 013,00 | 502,20 | 15 |
| Лот № 63 | Токарно-винторезный станок мод 16к20. Инв. № КТ01520314 | 5 054,00 | 561,60 | 10 |
| Лот № 64 | Токарно-винторезный станок мод. 16ВТ20П-21. Инв. № КТ55534 | 12 053,00 | 669,60 | 5 |

**Аукцион состоится 27.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», проводимом 27.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 22.12.2018 в 14.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.10.2018 г.

**Организатор аукциона, тел.: 8 (017) 324-70-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 28 декабря 2018 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, находящегося в оперативном управлении учреждения «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) |
|---|
| Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 620/D-22089, площадью 110,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622250600001001963, площадью 0,0742 га по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Янки Купалы, 17-2 |
| Начальная цена – 34 900,00 долларов США |
| Сумма задатка – 7 200,00 бел. руб. |
| Дополнительная информация: наличие задолженности за потребленную электроэнергию и газ нанимателей, ранее проживавших в изолированном помещении |

**Продавец имущества:** учреждение «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси», пр-т Победителей, 21, 220126, г. Минск, телефон (017) 203-90-35.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 2 процентам от наивысшей цены предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества, подлежащая оплате в белорусских рублях, определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 28 декабря 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 11.12.2018 по 26.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 203-94-15 (учреждение «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси»)

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит»

**Лот № 1.** Гараж, инв. № 200/С-58561. Площадь – 109,4 кв. м. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, д. 27А. **Начальная цена, бел. руб.** – 15 360,00 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 1 600,00. **Шаг аукциона** – 5 %

**Земельный участок** площадью 0,0183 га с кадастровым номером 221200000001000174. Целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания гаража. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Обременение:** договор аренды от 01.11.2018 № 273 (109,4 кв. м), действует по 31.10.2021

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.
3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 2 000,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 11.01.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Доломит» 211321, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 11.01.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 09.01.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Григорьев Владимир Александрович, тел. 8 (0212) 69-81-66

**Организатор аукциона, тел.: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что 21 декабря 2018 года состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания в 9.00. Регистрация акционеров с 8.30. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

О проведении закрытой подписки на акции ОАО «Минскоблхлебопродукт».

Об увеличении уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт» на сумму неденежного вклада, вносимого акционером общества – Минским областным исполнительным комитетом путем выпуска дополнительных акций и утверждении условий закрытой подписки на дополнительные акции.

Тел. 220-59-17.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»

УНП 600013173

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что 21 декабря 2018 года состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания в 14.00. Регистрация акционеров с 13.30. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

Об утверждении результатов закрытой подписки на акции ОАО «Минскоблхлебопродукт» дополнительного выпуска.

Об утверждении актов о приеме-передаче имущества, внесенного в виде неденежного вклада в уставный фонд открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».

Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Минскоблхлебопродукт».

О внесении изменений в устав ОАО «Минскоблхлебопродукт».

О передаче принятого имущества в хозяйственное ведение Унитарного предприятия «Борисовский комбинат хлебопродуктов» и утверждении передаточного акта.

Тел. 220-59-17.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»

УНП 600013173

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Вишневка-2010» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**коровник** инв. № **600/С-128566** общей площадью **2 199,9 кв. м;**

**навозохранилище (сооружение)** инв. № **600/С-128988,** площадь застройки – 916 кв. м, объем (емкость) – 1850 куб. м;

**силосная яма (сооружение)** инв. № **600/С-128588,** площадь застройки – 808 кв. м, объем (емкость) – 1420 куб. м **(далее – объекты).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **623600000001004394** площадью **1,1958 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минский район, Юзуфовский с/с, район, д. Угляны.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: ограничения прав на земельные участки, расположенные на мелиорируемых (мелиорированных) землях, площадью 0,0075 га.*

Начальная цена объектов с НДС (20 %) – **106 440,00 бел. руб.** Стоимость снижена на 50 %. Задаток 10 % от начальной цены – **10 644,00 бел. руб.**

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 02.02.2018, 28.04.2018, 22.05.2018, 13.06.2018, 24.07.2018, 30.08.2018 и 29.09.2018. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **27.12.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.12.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

ОАО «Кристалл-Маг» извещает: в объявлении опубликованном в газете «Звязда» 08.12.2018 г. № 237 внести следующее изменение – п. 7 **(срок аренды помещения следует читать – 3 года).** УНП 200168503

Кніжная паліца

# НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК

**У свой час я напісаў апавяданне «Макар і дарога» — яго надрукаваў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Будучы ў Мінску, пачуў камплімент ад аднаго з вядомых пісьменнікаў: «У адным апавяданні ты ўмясціў столькі жыцця, што ў мяне склалася ўражанне, быццам я прачытаў раман». З лёгкай, як кажуць, рукі старэйшага таварыша я і пачаў пісаць жыццёвінкі — зусім кароткія творы, на старонку, а то і менш.**




Пазней адзін крытык папракнуў мяне, што я «разбазарваю» цікавыя сюжэты, маўляў, з асобных жыццёвінак можна зрабіць не толькі прыстойнае апавяданне, але і аповесць напісаць. Не шкада хіба? Ніколечкі! Затое я эканомлю час паважанага чытача. Пры гэтым, заўважу, калі ўдаецца чарговая жыццёвінка, я на сёмым небе ад шчасця — радуюся, быццам раман напісаў! Так што, паважаны чытач, на сёмым небе я быў ажно 110 разоў! Менавіта столькі жыццёвінак змешчана ў новай кнізе.

Перш чым з'явіўся асобны том, жыццёвінкі ахвотна друкавалі газета «Звязда», штотыднёвік «Літаратура і мастацтва» і часопіс «Полымя», адкуль паведамлялі, што людзі не шкадуюць добрых водгукаў і чакаюць новых жыццёвінак. Гэта натхняла. Цёплае слова, як вядома, ніколі не шкодзіць творчаму чалавеку. Аўтар жыццёвінак не выключэнне.

Ахвотна працягваю працаваць у некалі абраным жанры і спадзяюся, што жыццёвінкі, перш чым стаць другой кнігай (хоць і праз некалькі гадоў, канешне), таксама спадабаюцца чытачам шаноўнай «Звязды» і іншых выданняў.

Ні ў якім разе не стаўлю кропку.

**Васіль ТКАЧОЎ,**
**лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі.**

## Найболей чытаюць «Дзіцячы атлас Беларусі»

У сістэме кнігарняў «Белкнігі» падведзены рэйтынг продажу выданняў на беларускай мове за студзень — лістапад. Лідзіруе «Дзіцячы атлас Беларусі» — пазнавальная кніга выдавецтва «Мастацкая літаратура». У гэтай кнігі знайшлося 636 пакупнікоў па ўсёй краіне.

А што яшчэ найболей набывалі за гэты перыяд у болей як 100 «пунктах» «Белкнігі»? «Гэта Беларусь, дзетка!» — 493 асобнікі. А яшчэ — раман «Ноч» Віктара Марціновіча, зборнік «Беларускія казкі» і «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча. Дарэчы, у рэйтынгу продажаў — чатыры кнігі У. Караткевіча: акрамя згаданай аповесці — «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі» і «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Калі «Дзікага палявання караля Стаха» прададзена 288 экзэмпляраў, то раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» набылі ўсяго 42 пакупнікі.

Сярод кніг (у рэйтынг уключана 45 назваў з дыяпазонам продажаў ад 636 да 28 экзэмпляраў) дзіцячых пісьменнікаў у лідарах — гісторыка-краязнаўчая кніга Міколы Маляўкі «Спадчына, або каб не стаць манкуртам» (прадалі 157 асобнікаў) і зборнік вершаў Міколы Чарняўскага «Колькі ў сонейка сяброў!» (кнігу набылі 132 чалавекі). Такія ўжо зацікаўленні тых, хто не шкадуе свой рубель на набыццё кніг для сябе і для сваіх дзетак.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## Извещение о проведении аукциона по продаже объектов недвижимости коммунального унитарного предприятия по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда»

| | |
|---|---|
| Предмет аукциона и его местонахождение | **Лот № 1** – комплекс зданий и сооружений, расположенные по адресу: пр-т Индустриальный,15, 15/1, 15/2, 15/3, 15/4, 15/7, 15/8, 15/9, 15/10, 15/11, 15/12, 15/13, в г. Сморгони Гродненской области |
| Начальная цена предмета аукциона | 2 802 721 руб. 20 коп. (в том числе НДС 20% 467 120 руб. 20 коп.) |
| Продавец недвижимого имущества | Коммунальное унитарное предприятие по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда».<br>Адрес: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301 (УНП 500213060), тел.: +375 (29) 866-10-00 (МТС), +375 (1592) 469-42 |
| Характеристика объектов | **Капитальные строения с инв. №№:**<br>**443/С-18681 – здание главного производственного корпуса** – 1990 г. п., одноэтажное панельно-кирпичное (КТП-1, КТП-2, КТП-3), S общ. – 20211,9 кв. м; **очистные сооружения; БСЦ; галерея; КПП; ворота; забор**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ИЧУПП «Электроинжиниринг» Мазурина В. И. – 65,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.03.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 1668, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ИП Насекайло З. Ф. – 144, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 16.07.2020 г.<br>ООО «Вендмирус» – 64,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18682 – здание склада готовой продукции** – 1990 г. п., одноэтажное асбестоцементное, S общ. – 11860,0 кв. м; **склад закрытый; склад открытый.** Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Бальга» – 100,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.12.2018 г.<br>**443/С-18683 – здание административно-бытового корпуса** – 1990 г. п., трехэтажное кирпично-панельное, S общ. – 2849,0 кв. м; **с подвалом**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Норд Транс Логистик» – 12,5 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 66,9, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Нанотехновак» – 108, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 07.10.2019 г.<br>ООО «Вендмирус» – 17,6 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «Групп Эверс» – 17,8 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 04.12.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18684 – здание складского блока с зарядной** – 1990 г. п., одноэтажное кирпично-шиферное, S общ. – 1198,8 кв. м. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ЧПУП «МеханикЭнерго» – 329,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.02.2019 г.<br>**443/С-18685 – бытовое здание склада готовой продукции** – 1994 г. п., одноэтажное панельное, S общ. – 57,0 кв. м;<br>**443/С-18671 – градирня** – 1990 г. п., одноэтажное шиферное, S общ. – 40,0 кв. м;<br>**443/С-21676 – здание склада цемента** – 1990 г. п., одноэтажный кирпичный, S общ. – 343,5 кв. м; **подвал ж/б**; **рампа**; **опорные конструкции под силоса**; **силоса**;<br>**443/С-21677 – склад заполнителей** – 1990 г. п.; в составе **транспортировочная, галерея, галерея, прием песка, приемочный бункер, транспортировочная, прием керамзита и щебня, приемочный бункер, транспортировочная, склад заполнителей, техническое здание, натяжная станция, передаточная, приемный отдел керамзита и щебня, техническое здание;**<br>**443/С-21661 – здание склада ГСМ и эмульсола** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 62,1 кв. м;<br>**443/С-21662 – компрессорная** – 1990 г. п., двухэтажная железобетонная, S общ. – 602,3 кв. м; **подвал бетонный**;<br>**443/С-21663 – отделение приготовления химдобавок** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 167,7 кв. м; **подвал ж/б**;<br>**443/С-21664 – здание КПП** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 9,6 кв. м;<br>**443/С-21665 – внутриплощадочные и внеплощадочные электросети:** протяженность линейного сооружения – 389,3 м;<br>**443/С-21666 – автодороги,** протяженность – 1920,4 м; бетон, асфальтобетон;<br>**443/С-21667 – сети связи и сигнализации,** протяженность линейного сооружения – 14,0 м;<br>**443/С-21668 – сети водопровода**, протяженность линейного сооружения – 66,5 м.<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 694,00 м, расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0328 по бух. учету).<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 826,80 м, расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0329 по бух. учету) |
| Информация о земельном участке | Площадь земельного участка с кадастровым номером 425650100001004336 – 9,4471 га. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности |
| Условия использования земельных участков | |
| Ограничения по использованию земельного участка | Право постоянного пользования |
| Условия проведения аукциона | *Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона. Условия оплаты по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее* ***20*** *рабочих дней с момента подписания протокола аукциона* |

1. **Аукцион состоится 14 января 2019 года в 12.00 по адресу: 231044, Гродненская обл., г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301**. Заявки принимаются с 9.30 до 17.00 по электронной почте nisabel@mail.ru, а также по адресу: г. Гродно, 230023, а/я 174. Последний день подачи заявлений – **13 января 2019 года до 24.00**.

2. **Организатор аукциона** – ***Индивидуальный предприниматель Бойкова Наталья Николаевна, почтовый адрес: 230023, г. Гродно, а/я 174, тел.: +375 (29) 866-10-00 (МТС), +375 (152) 68-57-55 (оф.), (время работы с 9.30 до 16.00, кроме выходных и праздничных дней), e-mail: nisabel@mail.ru.***

3. **Порядок ознакомления с имуществом, являющимся предметом торгов,** – до окончания срока приема заявок на участие в торгах можно ознакомиться с информацией об имуществе, составляющем предмет продажи (пн. – пт. с 9.30 до 17.00) по адресу: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15 (тел. +375 (29) 633-74-08).

4. **Место нахождение предмета аукциона** – Гродненская область, г. Сморгонь, проспект Индустриальный, д. 15. Земельный участок с кадастровым номером 425650100001004336, площадь – 9,4471 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий ликвидированного завода КПД.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 16 от 8 января 2013 г. Аукцион является открытым.

5.1. Порядок проведения торгов: шаг аукциона составляет 5 % от начальной цены предмера аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

6. **Размер задатка для участия в аукционе – 200 000 руб. 00 коп.** Задаток перечисляется на р/с BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда», УНП 500213060.

7. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на *текущий (расчетный) счет продавца №* BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда», УНП 500213060;

копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством) – **для юридических лиц-резидентов Республики Беларусь;**

копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона – **для индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь;**

нотариально удостоверенная доверенность – **для представителя гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя;**

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для юридического лица, иной организации – нерезидента Республики Беларусь;**

легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь;**

легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя.**

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

5. Организатор торгов после опубликования извещения вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

## СПЯВАЧКА АНІ ЛОРАК У КАМАНДЗЕ ЗОРНЫХ ПАСЛОЎ

**Вядомая эстрадная выканаўца, народная артыстка Украіны Ані Лорак стала ўладальніцай ганаровага звання «Зорны пасол II Еўрапейскіх гульняў 2019 года».**



Перадаючы адпаведны сертыфікат Ані Лорак, **дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН** адзначыў:

— Музыка і спорт сціраюць межы, збліжаюць краіны і народы. Уручаючы гэты сертыфікат, я хацеў бы выказаць упэўненасць у тым, што велізарная армія музычных прыхільнікаў злучыцца з войскам спартыўных балельшчыкаў і ў наступным годзе мы разам зможам адзначыць самую яркую падзею года — II Еўрапейскія гульні.

Спявачка, якая далучылася да каманды зорных паслоў Гульняў, шырока вядомая сваёй грамадскай дзейнасцю і ўдзелам у дабрачынных праектах, у тым ліку пад эгідай Дзіцячага Фонду ААН (ЮНІСЕФ). З падзякай яна ўспрыняла і запрашэнне паўдзельнічаць у прапагандзе наибўйнейшага спартыўнага форуму Еўропы, які адбудзецца ў Мінску.

У лік зорных паслоў увойдуць выдатныя беларускія і замежныя асобы са свету спорту, мастацтва і культуры. Першым уладальнікам высокага тытула 24 ліпеня стала чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка па біятлоне Дар'я Домрачава. Пасля да гэтай каманды далучыліся вядомыя цыркавыя дрэсіроўшчыкі, народныя артысты Расіі Аскольд і Эдгард Запашныя, алімпійскі чэмпіён 2008 года па веславанні на байдарках і каноэ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Аляксандр Багдановіч, лёгкаатлетка, чэмпіёнка Еўропы 2018 года ў бегу на марафонскай дыстанцыі Вольга Мазуронак, трохразовы алімпійскі чэмпіён па вольнай барацьбе Аляксандр Мядзведзь, блогер і тэлевядучая Ганна Бонд, піяніст і дырыжор Расціслаў Крымер, а таксама прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь доктар Рашэд Мустафа Сарвар, які выступае ў гэтай ролі ад імя міжнароднай арганізацыі.

# ЖЫЦЦЁ НА ЛЁДЗЕ

## Гісторыя фігурыстаў, якія збіраюцца прадставіць краіну на чэмпіянаце Еўропы



**У дваццатых чыслах студзеня ў Мінску ўпершыню пройдзе маштабны турнір па фігурным катанні. Чэмпіянат Еўропы збярэ найлепшых спартсменаў кантынента. Сярод іх выступяць і беларускія атлеты, канкрэтныя імёны будуць вядомыя пасля апошняга адборачнага старту — чэмпіянату краіны. Найбольш відавочнымі прэтэндэнтамі ў танцах на лёдзе сёння з'яўляецца пара Юрый Гуліцкі і Ганна Кублікова. Карэспандэнты «Звязды» зазірнулі на іх трэніроўку, каб пазнаёміцца бліжэй.**

* * *

Па рамках танцаў на лёдзе Юрый і Ганна пара вельмі маладая, разам яны ўсяго паўтара года. Ганна пачынала займацца фігурным катаннем у невялікім расійскім гарадку Кіраве, да 8 гадоў дзяўчынка спрабавала развівацца ў адзіночным катанні, але пазней па рэкамендацыях трэнераў перайшла ў танцы. Каб вырасці ў прафесійную спартсменку, у 12 гадоў разам з бацькамі Ганна Кублікова перабралася ў Маскву, у групу вядомага фігурыста і трэнера Аляксандра Жуліна. З першымі партнёрамі ў сталіцы адносіны не складзіся, Ганна працягнула катацца ў Кацярыны Рублёвай, але зноў засталася адна, яе напарнік вырашыў з'ехаць у Амерыку. «Год каталася без партнёра, ужо страціла ўсе надзеі і скончыла са спортам, — успамінае фігурыстка. — Спрабавала зарабляць на шоу і трэніравацца. Нават не думала, што зноў буду катацца ў прафесійным спорце». Але адзін з трэнераў Пётр Дурнеў прапанаваў Ганне звярнуць увагу на беларускага хлопчыка Юру, які ў той час таксама аказаўся без партнёркі. Так і склаўся новы танцавальны дуэт. «Фізічна было вельмі цяжка вяртацца, год, напэўна, я толькі ўваходзіла ў гэты рытм», — раказвае Аня. Тое, што дзяўчыне давялося памяняць краіну і грамадзянства, яе не засмучае. «Мне проста хацелася выступаць, катацца за Беларусь было адзіным шанцам вярнуцца ў вялікі спорт. І гэтаму я вельмі рада», — адзначае фігурыстка.



А вось Юрый Гуліцкі — ураджэнец Мінска, таму лёд чэмпіянату Еўропы стане для яго родным. Ён пачаў займацца фігурным катаннем у чатыры з паловай гады і спачатку таксама лічыўся адзіночнікам. Адзін з самых паважаных спецыялістаў краіны Яўген Тарасаў прапанаваў Юру паспрабаваць сябе ў танцах на лёдзе, фігурысту хутка знайшлі партнёрку, і Юра стаў прагрэсаваць. Доўгі час хлопец катаўся з Яўгеніяй Ткачэнкай, але нядаўна дзяўчына з прычыны праблем са здароўем пакінула прафесійны спорт. Пасля няўдалых спроб з іншымі партнёркамі ў красавіку 2017 году Юрый устаў у пару з Ганнай Кубліковай. «Мы ўдзячныя і трэнерам, і Беларускаму саюзу канькабежцаў, што ў нас ёсць магчымасць катацца разам і выступаць за Беларусь», — адзначае Юрый.

* * *

Падрыхтоўку да чэмпіянату Еўропы яны пачалі з лета. Спачатку закладвалі агульнафізічную базу, затым прайшлі зборы ў падмаскоўным Навагорску разам з групай Аляксандра Жуліна, з якімі беларуская пара трэніруецца досыць часта. «У нас вялікая група трэнераў, ёсць спецыялісты па акрабатыцы, харэаграфіі, артыстызму, — расказвае Юрый. — Усе ўкладаюць і даюць нешта сваё. У цэлым гэтая работа вельмі цікавая, дружны калектыў не толькі трэнераў, але і саміх спартсменаў».

Ганна дадае, што разам з імі ў групе Жуліна трэніруецца наймацнейшая расійская пара Вікторыя Сініцына / Мікіта Кацалапаў і высокага ўзроўню іспанскі дуэт. «Нам пашанцавала аказацца з імі, ёсць на каго глядзець, на каго раўняцца, таму што і тэхнічна, і па харэаграфіі гэта вельмі моцныя спартсмены».

Па ходзе сезона Гуліцкі і Кублікова змаглі паўдзельнічаць у кантрольных пракатах нацыянальнай зборнай і ў міжнародных турнірах серыі Б Міжнароднага саюза канькабежцаў. Беларуская пара выступіла на турнірах у Брацілаве, Мінску, Андоры і Заграбе.

«На першым старце ў Брацілаве не абышлося без памылак, праграма была яшчэ не настолькі скатаная. Але пасля гэтага мы шчыльна папрацавалі над памылкамі і цяпер у Андоры паказалі нашмат лепшае катанне і вынік. Занялі другое месца, гэта нашы першыя медалі на міжнародным турніры», — адзначае Ганна.

У Мінску танцавальнаму дуэту не хапіла зусім трохі да п'едэстала. «Пракаты былі няддрэнныя, у кароткай праграме мы выступілі выдатна, у адвольнай трохі горш з-за ўзніклых праблем са здароўем, — аналізуе Юрый. — Ну і да таго ж былі дуэты, якія мацнейшыя за нас, якія даўно катаюцца і зарэкамендавалі сябе перад суддзямі. У нашым відзе спорту вельмі важна знаходзіцца ўвесь час на вачах у суддзяў, каб яны не забывалі пару, пастаянна бачылі яе. Гэта, магчыма, таксама паўплывала на расстаноўку месцаў».

* * *

Наогул, фігурысты адзначаюць, што для танцаў на лёдзе паўтара года разам — гэта вельмі маленькі тэрмін. Хоць за гэты час яны ўжо вывучылі характары адзін аднаго, навучыліся адчуваць рух адзін аднаго на лёдзе. «Гэта вельмі важна. Спачатку было цяжка, але дзякуючы трэнерам мы паступова знаходзім аднолькавы падыход», — запэўнівае Юра. Ганна ж адзначае, што пакольку элементы ў фігурным катанні не толькі складаныя, але і часам вельмі небяспечныя, не абысціся без даверу. «І, вядома, без добрых адносін на лёдзе і павагі не дабіцца вынікаў», — дадае дзяўчына.

Калі казаць пра агульныя поспехі гэтай пары, за паўтара года разам яны сталі сярэбранымі прызёрамі чэмпіянату Беларусі, сёлета заваявалі «серабро» на міжнародным турніры ў Андоры. «Заўсёды прыемна, калі катаешся чыста і без вялікіх памылак, калі сыходзіш з лёду і разумееш, што зрабіў усё, што мог, — расказвае Юрый Гуліцкі. — Менш за тыдзень у нас застаецца да чэмпіянату Беларусі, па яго выніках мы даведаемся, ці адбяромся на чэмпіянат Еўропы».

Чакаецца, што ў цяперашнім першынстве краіны возьме ўдзел пяць танцавальных дуэтаў, але гэта ў асноўным юніёрскія пары, якія ўпершыню паспрабуюць сябе на дарослым узроўні, таму шанцы трапіць на чэмпіянат кантынента ў Юрыя і Ганны вялікія.

Што датычыцца планаў на чэмпіянат Еўропы, трэнерскі штаб не ставіць перад парай задачы, фігурысты робяць гэта самі. «Задача заўсёды адна — паказаць усё, што мы ўмеем, усё, што напрацавалі за гэты час», — кажа Ганна. Юрый дадае: «Мы будзем старацца трапіць у адвольны танец, гэта значыць прайсці кваліфікацыю ў кароткім — трапіць у 20-ку наймацнейшых».

Яны абое адзначаюць, што выступаць дома ім будзе вельмі прыемна, і спадзяюцца, што дамашнія трыбуны дапамогуць адкатаца годна. «Гэта прыемна і адказна. Вядома, хваляванне будзе прысутнічаць, але горш, калі не хвалюешся. Гэта значыць, штосьці няправільна ў цябе ў галаве, — дзеліцца меркаваннем Юрый. — Думаю, турнір у Мінску будзе класны. Вопыту выступлення на такіх турнірах у нас няма, у мяне ў кар'еры было два выступленні на чэмпіянаце свету сярод юніёраў, а ўжо на дарослым узроўні такіх турніраў не было».

Ганна напрыканцы дадае: «Мы вельмі спадзяёмся, што трыбуны «Мінск-арэны» будуць максімальна запоўнены на ўсіх спаборніцтвах, а не толькі на гала-канцэрце. Спадзяёмся, што людзі прыйдуць, бо фігурнае катанне — від спорту, які вельмі набліжаны да мастацтва. Гэта прыгожа, складана, эфектна».



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Дзмітрый НІКУЛЕНКАЎ:

# «АКАЗВАЕЦЦА, Я НЕ ВЕДАЎ, ШТО ТАКОЕ ГАНДБОЛ»

## Аб сваім гучным пераходзе з БГК імя Мяшкова ў мінскі СКА, надзеях зборнай і будучай рабоце



**Дзмітрый Нікуленкаў у гандболе ўжо два дзесяцігоддзі, за яго плячыма выступленні ў элітных клубах свету — польскім «Віве», мінскім «Дынама», брэсцкім БГК. І рэгулярна добрыя гульні за зборную краіны. Увесну чуткі, у якія доўгі час не верылі балельшчыкі ручнога мяча, аб пераходзе дасведчанага гульца ў мінскі СКА, сталі рэальнасцю. Нікуленкаў правёў з армейцамі доўгія летнія зборы і ўжо адыграў у сваім новым клубе практычна паўсезона. І толькі цяпер, як прызнаецца сам Дзмітрый, па-сапраўднаму даведаўся, што такое гандбол. Пра тое, як гуляць з партнёрамі, якія практычна ўдвая маладзейшыя, і ці ёсць шанц у зборнай Беларусі вярнуцца ў эліту і адабрацца на Алімпійскія гульні, Дзмітрый Нікуленкаў расказаў у сваім інтэрв'ю.**

### Аб клубе: «Будзем біцца, абяцаю!»

***— Дзмітрый, у СКА вы правялі ўжо чатыры месяцы, не пашкадавалі аб сваім выбары?***

— Пачну з таго, чаму наогул цяпер я знаходжуся ў СКА, бо па вялікім рахунку мог бы ўжо і «завязаць» з гандболам. Усё проста, я вельмі люблю гэтую гульню! За месяцы работы ў стане армейцаў я ўсім задаволены, мне падабаецца працаваць з маладымі, нешта ім падказваць. Наогул, паглядзець з іншага боку на гандбол, таму што, шчыра кажучы, аказваецца, я не бачыў беларускага гандбола зусім. У СКА я гуляю з маладымі хлопцамі, у якіх вельмі вялікі патэнцыял, спадзяюся, праз нейкі час яны раскрыюцца ў поўнай меры, і мне хочацца, каб з маёй дапамогай гэта адбылося нашмат хутчэй.

***— Што аказалася самым складаным у СКА для вас?***

— Цяжка гуляць з маладымі. Я 20 гадоў у гандболе, але, як аказалася, мы з маладымі цалкам па-рознаму бачым гэтую гульню. Тры месяцы пайшло на прыцірку, тлумачэнне нейкіх маленькіх рэчаў, якія яны не разумелі, не бачылі. Але цяпер, я думаю, у нас ураўноўваецца бачанне гульні. Шкада, вядома, што няма гульняў з высокім напалам, як, скажам, з Брэстам, або матчаў у Еўракубках, з дапамогай іх мы б хутчэй навучыліся разумець адзін аднаго.

**«Наша мэта — выйсці на чэмпіянат Еўропы — 2020, і з упэўненасцю вам скажу, што мы выйдзем на гэты чэмпіянат».**

***— Для вас не складае цяжкасці, акрамя гульца, выступаць яшчэ і ў ролі настаўніка?***

— Не, я ўсё ж такі занадта люблю гэтую гульню, паўтаруся, таму і прыйшоў у СКА, хоць было шмат прапаноў, у тым ліку з Бундэслігі, Румыніі, Партугаліі. Мне гэта нават падабаецца, я дарэчы, зараз і вучуся на трэнера, так што, можна сказаць, і трохі практыкую.

***— За межамі пляцоўкі маеце зносіны з моладдзю?***

— Трэба разумець, што ў нас зусім розныя інтарэсы. Напрыклад, калі ў мяне і ў Вані Броўкі ёсць дзеці, жонка, то ў абсалютнай большасці хлопцаў — не. Калі выязджаем на гульні, мы, вядома, можам і кавы папіць, і абмеркаваць нейкія пытанні, што адбываецца ў гандболе, паглядзець матчы Лігі чэмпіёнаў і таксама чамусьці павучыцца.




***— Ці склаліся ў вас адносіны з галоўным трэнерам Ігарам Папругай?***

— Так, сапраўды скажу, не ведаў Ігара Мікалаевіча як настаўніка, таму што ў зборнай ён усё ж такі, як другі трэнер і трэнер варатароў. Тут гатовы зняць перад ім капялюш, таму што работа з маладымі гульцамі гэта вельмі цяжка. Ігар Мікалаевіч вырас, мне вельмі падабаецца, як ён вядзе каманду ў нейкіх момантах, як праводзіць трэніроўкі.

***— У гэтым сезоне СКА не ўдалося працягнуць выступленне ў розыгрышы кубка ЕГФ, ці не сумна гульцу вашага ўзроўню гуляць толькі ў чэмпіянаце Беларусі і Балтыйскай лізе?***

— Сумна, вядома. Не буду вас падманваць. Не хапае добрых гульняў, але што рабіць, па сутнасці, нам выпала самая цяжкая жараб'ёўка. «Порту», як мы бачым, трапіў у групавы турнір, абыграў адну з наймацнейшых камандаў — «Магдэбург», які займае цяпер другое месца ў чэмпіянаце Германіі. Мы змагаліся з «Порту», як маглі, але ўсё ж такі калі дома згулялі добра, то на выездзе маглі саступіць хоць бы тры мячы, а не пяць, дык мелі б шанцы прайсці далей. Аднак там бы нас чакаў «Магдэбург», і як бы скляліся сустрэчы з ім — невядома. Шкада, але што зробіць, гэта жыццё, гэта спорт. Ідзём далей.

***— У чэмпіянаце Беларусі не развіталіся з шанцамі адолець БГК?***

— Я з упэўненасцю скажу, мы будзем выходзіць на кожную гульню, як на апошні бой, і ніколі не дамо перадышкі БГК. Гэта я вам абяцаю.

***— Для вас асабіста гульні з брастаўчанамі носяць прынцыповы характар?***

— Гэта мая матывацыя, вядома ж, мне хочацца выйграць у БГК, але каб хацеў камусьці нешта даказаць — не.

***— Фармат Балтыйскай лігі ў гэтым сезоне змяніўся, цяпер СКА ў адной групе з галоўным канкурэнтам — фінскім «Коксам». Як вам турнір?***

— Калісьці з мінскім «Дынама» я нават выйграваў Балтыйскую лігу. Але цяпер гэта для мяне ўсё роўна нешта новае, і гэта таксама радуе. Фінская каманда сёлета «стрэліла» ў Лізе чэмпіёнаў, гэта таксама пэўная матывацыя для нашай каманды, думаю, гульні будуць цікавыя. Хацелася б трапіць у фінал чатырох і, вядома, выйграць тытул ужо са СКА.

***— Калі ўспомніць усю вашу кар'еру, за які клуб гуляць было прыемней за ўсё?***

— Так склалася, што ў «Дынама» не толькі для мяне, але і для хлопцаў, з якімі я гуляў (Дзяніс Рутэнка, Сяргей Шылові́ч, Павел Ацьман і іншыя) гэта былі найлепшыя часы. У нас была не проста каманда, не проста сабраны калектыў, каб дзесьці выйграваць, гэта была сям'я. Думаю, калі б «Дынама» не скончыла сваё існаванне, мы б і зараз там гулялі.

### Аб зборнай: «Прайсці нерэальны шлях»

***— Беларуская зборная ўпершыню за многія гады прапускае чэмпіянат свету, больш за тое, і адбор да чэмпіянату Еўропы 2020 года пачала нацыянальная каманда не вельмі паспяхова. У камандзе Шаўцова нешта змянілася ці гэта збег абставін?***

— Цяжка казаць пра гэта, пэўны спад, вядома, ёсць, але давайце не будзем забываць, што шэсць гадоў запар мы траплялі на ўсе топ-турніры. Вядома, дамашняя гульня з аўстрыйцамі, якая не дазволіла нам удзельнічаць у студзеньскім чэмпіянаце свету, не ўдалася. У кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы ў матчы з баснійцамі да 45 хвіліны ўсё складвалася добра, але прайгралі. Збег абставін гэта ці не, разбіраць нам, і ўсё гэта мы пакінем унутры каманды. Наша мэта — выйсці на чэмпіянат Еўропы — 2020, і з упэўненасцю вам скажу, што мы выйдзем на гэты чэмпіянат.

***— Каманду Босніі і Герцагавіны і зборную Фінляндыі мы ўжо бачылі, чэхаў яшчэ не. Барацьба з імі будзе складаная?***

— Гэта няпростая каманда, без нейкіх асаблівых зорак, але вельмі згуляны добры калектыў. Гэта я ведаю не па чутках — Павел Хорак мне многае расказваў. Але мы іх не баімся, настройваемся да красавіцкіх паядынкаў з імі, як на апошні бой.

***— Раней кіраўнік федэрацыі Уладзімір Канаплёў казаў пра планы на Алімпійскія гульні, у сувязі з апошнімі няўпэўненымі выступленнямі зборнай гэтыя мэты можна падвергнуць сумневам?***

— Так, але давайце казаць пра тое, што мэты заўсёды патрэбныя, без іх няма сэнсу кожнаму гандбалісту выходзіць на якую-небудзь гульню. Мэта нумар адзін — трапіць на Алімпійскія гульні, я, як узроставы гулец, ужо наўрад ці туды траплю, але, у прынцыпе, да 2020 года такая мара ёсць. Вельмі хочацца ў Токіа! На Алімпіяду вельмі цяжка трапляць у гандболе і наогул у гульнявых відах спорту, трэба прайсці нейкі нерэальны шлях. На чэмпіянаце свету трапіць у шасцёрку або выйграць чэмпіянат Еўропы, або трапіць там у тройку. Пасля гэтага ты трапляеш у кваліфікацыю на еўрапейскія каманды, якія таксама вельмі моцныя. Гэта няпроста, але гэта наша мэта, і мы будзем ісці да яе любымі шляхамі.

***— На працягу сваёй кар'еры вы некалькі разоў адчувалі сур'ёзныя праблемы з каленам, як цяпер сябе адчуваеце?***

— Пасля работы з Вадзімам Сашурыным усё прайшло *(смяецца)*. Не ведаю, супадзенне гэта ці не, але калена адчувае сябе нашмат лепш.

***— Пасля падпісання з вамі кантракта спартыўны дырэктар СКА Андрэй Крайноў казаў, што будзе за, калі вы і пасля завяршэння спартыўнай кар'еры застанецеся ў СКА.***

— Я не загадваю далёка ў будучыню, жыву цяперашнім. Няма жадання думаць, дзе я буду праз год, два ці тры. Складана сказаць не паспрабаваўшы, ці атрымацца ў мяне ў трэнерскай дзейнасці, але, думаю, я не проста так вучуся на трэнера.

---

Экспрэс-навіны

## Першыя заліковыя ачкі

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Ірына Крыўко ўваходзіць у дзясятку наймацнейшых біятланістак агульнага заліку пасля першага этапу Кубка свету.*** У актыве беларускі 87 ачкоў. Нагадаем, на стартавым адрэзку сезона ў славенскай Паклюцы Ірына Крыўко заняла 14-е месца ў індывідуальнай гонцы і атрымала 27 ачкоў, у спрынце яна стала 17-й (24 ачкі), а ў гонцы праследавання заняла сёмае месца (36 балаў).

Іншыя беларускія біятланісткі пасля выступлення ў Славеніі заліковых ачкоў не маюць. Узначальвае агульны залік Кубка свету італьянка Даратэя Вірэр — 144 ачкі. Другое месца (131 бал) у Кайсы Мякярайнен з Фінляндыі.

Другі этап Кубка свету па біятлоне прыме з 13 да 16 снежня аўстрыйскі Хахфільцэн.

**2.** ***Андрэй Казусёнак стаў пераможцам абсалютнага Кубка свету па самба на прызы Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, прысвечанага 80-годдзю самба.*** У турніры, які адбыўся ў Сочы, прымалі ўдзел 16 наймацнейшых атлетаў свету ў абсалютнай вагавой катэгорыі. Трохразовы чэмпіён свету і чатырохразовы пераможца чэмпіянатаў Еўропы ў катэгорыі да 100 кг Андрэй Казусёнак выйграў усе чатыры свае сустрэчы.

Трэцяе месца на турніры заняў яшчэ адзін прадстаўнік Беларусі Юрый Рыбак.

**3.** ***Валейбалісткі «Мінчанкі» прайгралі сапернiцам з «Сахаліна» ў расійскай суперлізе з лікам 2:3.*** Пасля пяці тураў у расійскай суперлізе ў актыве каманды Віктара Ганчарова пяць ачкоў і дзявяты радок у табліцы. Валейбалісткі «Сахаліна» з 11 баламі размясціліся на трэцім месцы.

Чарговы матч у суперлізе «Мінчанка» правядзе 23 снежня і прыме на сваёй пляцоўцы краснадарскае «Дынама». Сталічная каманда 14—15 снежня згуляе ў Кубку Беларусі, а 19 снежня прыме ў Лізе чэмпіёнаў італьянскую «Навару».

